**№№50–51 (3180–3181)**

2–5 красавіка 2010 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

**Да ўвагі!**
**Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!**

# Народная Воля

*На прастор, на шырокі разлог*
*Выходзі, мой народ, грамадою...*

***Якуб КОЛАС***

БЕСПРЭЦЭДЭНТНА!

# Павел Шарамет пазбаўлены беларускага грамадзянства

*У сераду вядомы журналіст Павел Шарамет, які ўжо дзесяць год жыве і працуе ў Маскве, быў афіцыйна праінфармаваны аб тым, што яго пазбавілі беларускага грамадзянства.*



Навіна прыйшла заказным лістом з Пасольства Беларусі ў Расійскай Федэрацыі, і падпісаны ён быў нават не паслом, а адным з сакратароў пасольства. У дакуменце сказана, што падставай для пазбаўлення грамадзянства стала атрыманне Шараметам грамадзянства Расійскай Федэрацыі. Хто прыняў такое рашэнне, з ліста не ясна.

*"Мне прапануецца прыйсці ў пасольства, здаць беларускі пашпарт, атрымаць даведку аб пазбаўленні мяне беларускага грамадзянства і заплаціць пошліну за гэту "даведку лішэнца" 7 еўра",* — расказаў журналіст. І цяпер ён спрабуе высветліць, якая менавіта структура прымала рашэнне аб пазбаўленні яго беларускага грамадзянства.

*"Як мне растлумачылі юрысты, рашэнне аб пазбаўленні грамадзянства прымае прэзідэнт. Паводле слоў юрыстаў, такое рашэнне можа быць прынята толькі ў адным выпадку: калі чалавек паступае на дзяржаўную, ваенную службу іншай дзяржавы або ў спецслужбы іншай дзяржавы. Я ж у Расіі ўвесь час працаваў карэспандэнтам тэлеканала ГРТ,* — сказаў журналіст. *— І ніводнага дня не працаваў ні на дзяржаўнай службе, ні ў сілавых структурах. Прычым ні ў Беларусі, ні ў Расіі".*

Паводле слоў журналіста, юрысты раяць яму падаваць у суд у сувязі з незаконнасцю прынятага рашэння. *"Я ж лічу, што гэта бессэнсоўна. Таксама не збіраюся хадзіць у пасольства, атрымліваць "даведку лішэнца". Беларускі бюджэт як-небудзь абыдзецца без маіх сямі еўра",* — заявіў Павел.

## У ТЭМУ

У маі 2008 года падчас online-канферэнцыі на сайце агенцтва БЕЛТА Андрэй Гіро, цяперашні пасол Беларусі ў Германіі, а тады начальнік консульскага ўпраўлення МЗС, растлумачыў: Беларусь не забараняе сваім грамадзянам атрымліваць двайное грамадзянства, але не прызнае яго. *"Дзейны закон дазваляе грамадзяніну Беларусі мець замежнае грамадзянства нароўні з грамадзянствам Рэспублікі Беларусь. Аднак пры гэтым за асобай, якая з'яўляецца грамадзянінам Беларусі, не прызнаецца прыналежнасць да грамадзянства замежнай дзяржавы",* — сказаў Гіро.

## З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

*"Гэта навіна пра пазбаўленне грамадзянства баліць у душы. З аднаго боку, я ўгаворваю сябе, што пашпарт — толькі паперка, якая нічога не вартая, ёсць дзяржава, а ёсць радзіма... Але, сапраўды, гэта ўдар... Хаця яны могуць забраць пашпарт, але не могуць забраць радзіму".*

**Павел ШАРАМЕТ.**

## АФІЦЫЙНА

### «Палітычных матываў няма»

Кіраўнік Дэпартамента грамадзянства і міграцыі МУС Аляксей Бягун заявіў Радыё Свабода, што Павел Шарамет страціў беларускае грамадзянства аўтаматычна, паколькі ён атрымаў грамадзянства іншай краіны.

Гэта нібыта адбылося на падставе закона "Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь", які дзейнічаў у 1999 годзе. Праз тры гады закон прынялі ў новай рэдакцыі, паводле якой аўтаматычная страта грамадзянства наступае не заўсёды, а толькі калі былы грамадзянін служыць у войску ці на дзяржаўнай службе краіны новага грамадзянства. Але гэтыя абмежаванні на Шарамета не пашыраюцца, кажа падпалкоўнік Аляксей Бягун:

*"Калі б ён грамадзянства РФ атрымаў пасля верасня 2002 года, ніякіх пытанняў не было б. Але ён атрымаў грамадзянства да гэтага тэрміну, таму на яго ў поўным памеры распаўсюджваўся закон у былой рэдакцыі".*

Паводле інфармацыі Аляксея Бегуна, праверку, якая выявіла, што Павел Шарамет мае расійскае грамадзянства, правяла амбасада Беларусі ў Расіі. Паводле слоў Аляксея Бегуна, *"палітычных матываў у пазбаўленні Паўла Шарамета грамадзянства няма".*

## ДОСЬЕ

### Павел Шарамет

Журналіст, адзін з арганізатараў сайта "Беларускі партызан", аўтар (сумесна са Святланай Калінкінай) кнігі "Случайный президент". Аўтар дакументальных фільмаў "Чэчэнскі дзённік", "Дзікае паляванне", "1991 — апошні год імперыі", "Апошняя вышыня генерала Лебедзя", "Карэйская пастка", "Споведзь ката" і іншых.

Нарадзіўся 28 лістапада 1971 года ў Мінску. Скончыў тры курсы гістфака БДУ, затым паступіў на факультэт міжнародных адносін Беларускага эканамічнага універсітэта. Свабодна валодае англійскай мовай.

У 1994—1995 гадах быў аўтарам і вядучым штотыднёвай аналітычнай праграмы "Праспект" на Беларускім тэлебачанні. Атрымаў у 1995 годзе прэмію Беларускага ПЭН-цэнтра імя Алеся Адамовіча як найлепшы тэлежурналіст Беларусі.

З жніўня 1995-га па жнівень 1996 года — галоўны рэдактар "Белорусской деловой газеты".

Працаваў на тэлекампаніі ГРТ: кіраўнік Беларускага бюро ГРТ, шэф-рэдактар аддзела карэспандэнцкай сеткі ГРТ, намеснік дырэктара Дырэкцыі інфармацыйных праграм ГРТ. З ліпеня 1999-га па сакавік 2000 года быў вядучым аналітычнай праграмы "Время" на ГРТ. Узначальваў аддзел спецыяльных праектаў Дырэкцыі дакументальнага кіно расійскага Першага канала.

У 1998 годзе атрымаў прэмію Міжнароднага камітэта абароны журналістаў за ўнёсак у развіццё свабоды слова. Неаднаразовы намінант прэміі ТЭФІ Акадэміі расійскага тэлебачання як "найлепшы рэпарцёр" і найлепшы дакументаліст. У 2002 годзе атрымаў прэмію Парламенцкай асамблеі АБСЕ "За журналістыку і дэмакратыю".

У 1998 годзе быў асуджаны беларускім судом на два гады ўмоўна за рэпартаж з беларуска-літоўскай мяжы.

## ДЛЯ РОЗДУМУ

### Савецкія норавы вяртаюцца?

Паводле артыкула 23 Закона СССР аб грамадзянстве ("Пазбаўленне грамадзянства СССР за дзеянні, якія робяць шкоду дзяржаўным інтарэсам ці дзяржаўнай бяспецы СССР"), у савецкія часы рашэннямі прэзідыума Вярхоўнага Савета былі пазбаўлены савецкага грамадзянства 175 чалавек, у тым ліку пісьменнікі Васіль Аксёнаў, Іосіф Бродскі, Уладзімір Вайновіч, Аляксандр Зіноўеў, Аляксандр Салжаніцын, музыка Мсціслаў Растраповіч, спявачка Галіна Вішнеўская, скульптар Эрнст Неізвестный, рэжысёры Юрый Любімаў і Андрэй Таркоўскі, шахматыст Віктар Карчной і іншыя.

Аб прымусовым пазбаўленні беларускага грамадзянства пакуль звестак не было. Падобна на тое, што Павел Шарамет стаў першым.

## ПРАТЭСТ

### «Гэтаму павінен быць пакладзены канец раз і назаўсёды»

Камітэт па абароне журналістаў (Нью-Йорк) зрабіў наступную заяву ў сувязі з рашэннем беларускіх улад пазбавіць Паўла Шарамета беларускага грамадзянства.

*"Камітэт абароны журналістаў заклікае беларускія ўлады неадкладна вярнуць Паўлу Шарамету грамадзянства і не чыніць ніякіх перашкод для наведвання ім сваёй роднай краіны. За сваю крытыку рэжыму прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі Шарамет сядзеў у турме, быў падвергнуты нападам і правакацыям з боку ўлад. Падобна на тое, што апошняе рашэнне беларускіх улад таксама з'яўляецца яшчэ адным звяном бесперапыннага ланцугу афіцыйнай помсты. Гэтаму павінен быць пакладзены канец раз і назаўсёды".*

## КАМПЕТЭНТНА

### У суд!

**Алег ГУЛАК, старшыня ГА "Беларускі Хельсінкскі камітэт":**

— Зразумела, што гэтае рашэнне палітычнае, але трэба гаварыць пра юрыдычны аспект. Наш закон аб грамадзянстве дапускае двайное грамадзянства, але пры гэтым дзяржава проста не бачыць за гэтым грамадзянінам правоў і абавязкаў, якія на яго ўскладае іншае грамадзянства. Падстава для пазбаўлення грамадзянства ёсць толькі тады, калі чалавек, што мае беларускае грамадзянства, пайшоў на службу ў паліцыю альбо ва ўзброеныя сілы іншай краіны. Такі закон быў уведзены ў дзеянне ў 2002 годзе.

Да Паўла Шарамета прымянілі зваротную сілу закона. Я думаю, што ў гэтай сітуацыі ёсць сэнс асპрэчваць, таму што новы закон паставіў чалавека ў лепшае становішча, чым гэта было дагэтуль. І ў даным выпадку прымяняецца новы закон, а не стары. Каб яны тады паспелі пазбавіць яго грамадзянства, то тады — калі ласка... Але таго закона ўжо няма, яго прымяняць зараз ніяк нельга.

## ЛІКБЕЗ

Калі ўлады дзейнічалі па законе, то рашэнне аб пазбаўленні Паўла Шарамета грамадзянства прымаў асабіста Аляксандр Лукашэнка. І, калі сыходзіць з дзеючага закона, рашэнне гэта незаконнае.

**Закон "Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь". Вытрымкі**

***Артыкул 3. Прынцыпы грамадзянства Рэспублікі Беларусь***

Грамадзянства Рэспублікі Беларусь грунтуецца на наступных прынцыпах:

— кожны мае права на грамадзянства;

— грамадзянства Рэспублікі Беларусь з'яўляецца роўным для ўсіх грамадзян Рэспублікі Беларусь незалежна ад падстаў яго набыцця;

— грамадзянства Рэспублікі Беларусь не можа быць дадзена супраць волі асобы;

— **ніхто не можа быць пазбаўлены грамадзянства Рэспублікі Беларусь** альбо права змяніць грамадзянства.

***Артыкул 16. Страта грамадзянства Рэспублікі Беларусь***

Грамадзянства Рэспублікі Беларусь страчваецца:

— у выніку паступлення асобы на вайсковую службу, службу ў паліцыю, органы бяспекі, юстыцыі і іншыя дзяржаўныя органы замежнай дзяржавы...

***Артыкул 22. Парадак адмены рашэння аб набыцці альбо спыненні грамадзянства Рэспублікі Беларусь***

Рашэнне аб набыцці альбо спыненні грамадзянства Рэспублікі Беларусь адмяняе Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь альбо ўпаўнаважаны ім орган, які прыняў такое рашэнне.

***Артыкул 28. Вырашэнне пытанняў грамадзянства Рэспублікі Беларусь***

Рашэнні аб прыёме ў грамадзянства Рэспублікі Беларусь і яго спыненні прымаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь або ва ўстаноўленым ім парадку.

Працэдура прымусовага пазбаўлення грамадзянства ўвогуле не прапісана ў законе, бо чытай артыкул 3...

радыё свабода

Тэл. (017) 266 39 52
СМС 391 22 24
svaboda@rferl.org
п/с 111, Менск, 220005, Беларусь

ад 28 сакавіка – новыя частоты, хвалі

| | | |
|---|---|---|
| 06:00-08:00 | 6105 кГц | 49 м |
| | 6120 кГц | 49 м |
| 18:00-20:00 | 7270 кГц | 41 м |
| | 9725 кГц | 31 м |
| 20:00-22:00 | 6050 кГц | 49 м |
| | 6105 кГц | 49 м |
| 22:00-24:00 | 5995 кГц | 49 м |
| | 9405 кГц | 31 м |

612 кГц 490 м сярэднія хвалі

www.svaboda.org

## Ён перамог смерць і вывеў тых, што былі ў яе палоне, на свабоду

*З Пасхальнага паслання Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага* ***Філарэта****, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі*



...Да Уваскрасення Хрыстовага лёс чалавека пасля зямнога скону быў такім, як кажа пра яго святы Іаў Шматпакутны: "Адыду, — і ўжо не вярнуся, — у краіну цемры і ценю смяротнага, у краіну змроку... дзе няма ладу, дзе цёмна, як сама цемра" (Іаў 10: 20—22).

І вось, Спасіцель "Хрыстос уваскрэс з мёртвых, смерцю смерць зваяваў і тым, што ў магілах, жыццё дараваў"!

Сын Божы не проста вярнуўся з царства мёртвых, не проста ажыў: Ён перамог смерць і вывеў тых, што былі ў яе палоне, на свабоду, Ён узвысіў жыццё кожнага чалавека да бажэственнай вышыні і напоўніў вечным сэнсам дні і гады зямной юдолі.

У час зямнога жыцця Хрыста Спасіцеля, як і сёння, далёка не ўсе веравалі ў існаванне духоўнага свету, у бессмяротнасць душы і ў жыццё вечнае. А калі так, то і сэнс жыцця, і яго мэта, і яго каштоўнасць разумеліся па-рознаму. Жыццё малых і слабых свету гэтага ўяўлялася малазначным і пазбаўленым высокага сэнсу. Багатыя і моцныя ўладарылі часцей за ўсё з жорсткасцю і надавалі значэнне толькі ўцехам і задавальненню сваіх жаданняў.

Уваскрасенне Хрыста Спасіцеля абвяргае меркаванне пра тое, што каштоўнасць чалавечага жыцця бывае рознай, што бессмяротная душа можа быць значнай для Тварца ў большай ці ў меншай ступені. Гасподзь Ісус Хрыстос цвёрда і недвухсэнсоўна ставіць на першы план бажэственную роўнасць усіх людзей.

Евангельская пропаведзь сцвярджае, што Бог не мае прадузятасці, і для Тварца няма розніцы паміж людзьмі ні па знатнасці паходжання, ні па ступені валодання ўладаю і багаццем, ні па месцы ў грамадскай іерархіі. Перад Аблічам Уседзяржыцеля толькі адно адрозненне істотнае: наколькі мы адрозніваемся сваёю здольнасцю любіць Бога і любіць бліжняга свайго як самога сябе (гл.: Мф. 22: 37—39).

Хрысціянская адказнасць нагадвае нам, што мы і бацькі нашы — адно, і мы пакліканы маліцца за іх, прымнажаючы бацькоўскую набожнасць і адкупаючы бацькоўскія грахі.

Памятаючы пра гэта і рыхтуючы сэрцы нашы да Пасхі Гасподняй, мы пяцікратна малітоўна паміналі спачылых, пачынаючы ад Усяленскай памінальнай мясапуснай суботы. І мы працягнем гэтую малітоўную лучнасць з нашымі продкамі ў дзень Радаўніцы, калі адзінымі вуснамі і адзіным сэрцам узрадуемся разам з тымі, якія адышлі да Бога, роднымі, суайчыннікамі і ўсімі адвеку спачылымі праваслаўнымі братамі і сёстрамі нашымі, што Хрыстос сапраўды ўваскрэс!

Сардэчна віншую з Пасхай Гасподняй усіх адзінаверных хрысціян, суайчыннікаў нашых, усіх, кім кіруе добрая воля, і ўсярадасна сведчу пра тое, што Хрыстос уваскрэс! Сапраўды ўваскрэс! Амінь.

## Вялікдзень — трыумф любові Хрыста

*З пастырскага паслання Арцыбіскупа* ***Тадэвуша Кандрусевіча****, Мітрапаліта Мінска-Магілёўскага*



Глыбокапаважаныя браты і сёстры!

Хрыстус уваскрос! Сапраўды ўваскрос! Гэты святочны велікодны вокліч гучыць сёння ва ўсім свеце. Сёлетні Вялікдзень набірае асаблівае значэнне, бо ўсе хрысціяне ў адзін дзень адзначаюць свята, якое з'яўляецца падмуркам нашай веры і надзеяй на вечнае жыццё.

Якім было б жыццё чалавека, калі б Сын Божы не прыйшоў у гэты свет і не збавіў яго? На гэтае пытанне можам даць наступны адказ: мы б не зведалі бязмежнай любові Бога, засталіся б духоўна памерлымі, без падмурку нашай веры, а жыццё нашае было б без надзеі.

Праўда аб уваскрасенні выхоўвае да сапраўднай надзеі. Хто верыць ва ўваскрасенне Хрыста, той павінен быць у авангардзе барацьбы супраць скептыцызму, эгаізму, адрачэння, індыферэнтызму і г.д. Сваімі словамі і справамі мы павінны абвяшчаць Добрую Навіну аб тым, што Пан уваскрос. Мы павінны абвяшчаць яе на вуліцах, на працы, ва універсітэтах, школах, бальніцах. Мы павінны перадаваць яе ўсім, кажучы: "Не бойцеся, Езус перамог моц злога духу і мы, дзякуючы Яго ласцы, таксама можам перамагчы яе". Перад аблiччам цяжкасцяў хрысціянін не павінен хаваць сваёй галавы падобна таму, як стравус хавае яе ў пясок. Наадварот, давяраючыся Богу, ён павінен імкнуцца да трыумфу маральнага закону, жыцця, праўды і справядлівасці.

Заданне Касцёла не заключаецца ў тым, каб будаваць грамадства, аднак пасланне Хрыста дае магчымасць унесці наш уклад у яго будаванне. Таму хрысціянін, узмоцнены праўдай уваскрасення Хрыста, павінен мець адвагу бараніць жыццё і каштоўнасці сям'і як галоўнай клеткі кожнага грамадства; дапамагаць будаваць грамадства на прынцыпах сацыяльнай справядлівасці, а не карупцыі; замест культуры нянавісці і гвалту спрыяць развіццю культуры любові; супрацьстаяць тэндэнцыям паліткарэктнасці ў маральных нормах, якія па сваёй сутнасці і прадвызначэнні нязменныя; садзейнічаць таму, каб моладзь атрымала не толькі добрую адукацыю, але і рэлігійнае выхаванне, якое дапаможа ёй заўсёды жыць надзеяй і не страціць яе.

Сёння мы радуемся ўваскрасенню Хрыста. Мы радуемся таму, што выйшлі з "велікапоснага шпіталю", калі так можна сказаць, з рэцэптам на лек, які не мае адпаведнікаў. У склад гэтага леку ўваходзяць тры інгрэдыенты: Апошняя Вячэра, цярпенні і крыжовая смерць Езуса Хрыста і Яго ўваскрасенне...

Віншую ўсіх людзей добрай волі. Усім вам жадаю шчаслівага Вялікадня. Няхай уваскрослы Езус заўсёды будзе з вамі, несучы ў вашае жыццё надзею, супакой і радасць.

Хрыстус уваскрос! Сапраўды ўваскрос!

## 1 красавіка на Брэстчыне зусім не жартоўна шукалі тэрарыстаў

*Літаральна перад здачай гэтага нумара ў друк стала вядома, што ў Брэсцкай вобласці праходзяць масавыяператрусы апазіцыянераў.*

Актывістаў апазіцыі абшукваюць на падставе ананімнага паведамлення аб магчымым тэракце.

Брэсцкі праваабаронца Уладзімір Вялічкін паведаміў: *"Мне патэлефанаваў каардынатар мясцовага аддзялення Партыі БНФ Алесь Рамановіч з Пінска і паспеў сказаць літаральна некалькі слоў: мяне забіраюць, ідзеператрус у мяне дома і ў дэмакратычнага актывіста Уладзіміра Зянько. Чуваць была прысутнасць некага* і на гэтым сувязь перарвалася".

Старшыня арганізацыі Партыі БНФ Драгічына Уладзімір Казека расказаў наступнае: *"Я не мог нават выказаць здагадку, што яны мне збіраюцца прад'явіць. Але аказалася, што была ананімка: нібыта я здольны здзейсніць тэрарыстычны акт, у прыватнасці, падарваць нафта- ці газаправод. А таксама здольны да забойства чыноўнікаў раённай вертыкалі і ўнутраных спраў — у знак помсты за ранейшыя затрыманні, суды і г.д. Акурат у гэтым ракурсе гадзіны паўтары і ішла гаворка. Але я адразу папярэдзіў, што ніякія паперы не буду падпісваць, бо такія абвінавачанні проста абражаюць маю чалавечую годнасць. Чым гэта скончыцца — пакуль не ведаю. Але ў мясцовае аддзяленне КДБ таксама выклікалі маіх знаёмых і проста пыталіся: ці здольны Казека здзейсніць тэрарыстычныя акты на тэрыторыі краіны?"*

Падобна на тое, што ў спецслужб нейкае вясенняе абвастрэнне.

## РЭЗАНАНС

*Іосіф Паўлавіч, калі знойдзеце магчымым, надрукуйце, калі ласка, мой водгук на інтэрв'ю з Вольгай Абрамавай ("НВ", 30 сакавіка — 1 красавіка б. г.). Не знаходжу слоў, як гэта ўсё можна назваць!*

*З павагай П.Садоўскі.*

### Падарвала здароўе на дзяржслужбе: Вольга Абрамава



Дыпламаваны марксіст-палітолаг Вольга Абрамава скардзіцца, што значную частку сваёй дэпутацкай пенсіі, якая складае 2 мільёны 358 тысяч рублёў, павінна траціць на папраўку здароўя: "...*в первую очередь меня беспокоит мое здоровье, подорванное на госслужбе...").* У другую чаргу былая дэпутатка абяцае стварыць "*прафесійна"*, *"не па-аматарску"* грамадскую арганізацыю *"з перспектывай перарастання ў сацыяльную партыю",* дзе яна збіраецца бараніць правы гарадскіх грамадзян, у тым ліку і пенсіянераў. Пакуль, праўда, цяжка са сродкамі: *"А для того, чтобы делать профессионально, сегодня не самое лучшее время, в стране — кризис...".* Шкада, я думаў, што дажыву да таго дня, калі сп.Вольга абароніць і мяне. Я таксама быў дэпутатам, нават членам Прэзідыума Вярхоўнага Савета 12-га склікання, старшынёй Камісіі па замежных справах, амбасадарам у ФРГ, кандыдат навук, дацэнт, але вось пенсію атрымліваю амаль у чатыры разы меншую, чым сп. Абрамава, — каля 140 еўра (у эквіваленце). Я ўжо 10 гадоў пенсіянер. Мог бы яшчэ працаваць па спецыяльнасці, здароўе дазваляе. Але ж дзяржава, а дакладней — улада не бярэ на працу: "няправільны" я дэпутат, апазіцыянер, бэнээфавец.

Я не заклікаю сп.Абрамаву адмовіцца ад такой добрай пенсіі: можа, праўда, здароўе падарвала? Толькі адно не разумею: як сп.Абрамава магла быць адначасна і дэпутаткай, і дзяржслужбоўкай? Нас у дэпутаты ў 1990 годзе **выбіралі**. Дзяржслужбоўцаў жа **прызначаюць.**

Як быць з гэтай закавыкай? Вы, спадарыня Абрамава, гаворыце: *"Граждане со всей страны постоянно и активно обращаются ко мне с просьбой: Ольга Михайловна, засучите рукава и напрягайтесь. Нам уже надоело, что вы ничего не делаете в наших интересах..."*

Праўда, Вольга Міхайлаўна, не таміце Вы людзей. Папраўляйце хутчэй здароўе ды вяртайцеся ў шэрагі барацьбітоў. Але скажыце вашым прыхільнікам-выбарцам, каб звярталіся не да Вас, а туды, дзе дэпутатаў прызначаюць...

**З экс-дэпутацкім прывітаннем —**

**Пётр САДОЎСКІ.**

## «Газпром» панізіў Сямашку

Намеснік старшыні РАТ "Газпром" Валерый Голубеў стаў кіраўніком назіральнага савета "Белтрансгазу".

Рашэнне было прынята на гадавым сходзе акцыянераў "Белтрансгазу" ў Мінску. Раней назіральны савет "Белтрансгазу" ўзначальваў першы віцэ-прэм'ер Беларусі Уладзімір Сямашка, адзначае БелаПАН.

Змены таксама адбыліся ў складзе савета. Раней туды ўваходзілі пяць прадстаўнікоў Беларусі і тры — Расіі, а цяпер — па чатыры прадстаўнікі з кожнага боку.

Назіральны савет абраў дырэкцыю "Белтрансгазу". Гендырэктарам кампаніі зноў зацверджаны Уладзімір Маёраў.

## ААН: Беларусь скандальна парушыла свае міжнародныя абавязацельствы

Камітэт ААН па правах чалавека асудзіў выкананне ў Беларусі двух смяротных пакаранняў.

Пра гэта гаворыцца ў прэсрэлізе Камітэта ААН па правах чалавека.

Спецыяльны дакладчык Камітэта па новых паведамленнях і часовых мерах Крысціна Шане заявіла, што Камітэт ААН па правах чалавека прасіў урад Беларусі да заканчэння разгляду спраў двух беларускіх грамадзян Васіля Юзэпчука і Андрэя Жука адкласці выкананне супраць іх смяротнага пакарання. Аднак людзі былі расстраляныя. Беларуская дзяржава праігнаравала гэтую просьбу, чым скандальна парушыла свае міжнародныя абавязацельствы, якія вынікаюць з Факультатыўнага пратакола да Пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, падпісанага Беларуссю.

Шане таксама паведаміла, што ў мінулы чацвер Камітэт накіраваў ліст афіцыйнаму Мінску з патрабаваннем тлумачэнняў выканання смяротнага пакарання ў дачыненні да двух чалавек, аднак яны так і не былі атрыманыя.

Як лічыць прадстаўнік Камітэта па правах чалавека са Швецыі Крыстэр Тэлінг, ігнараванне Беларуссю сваіх міжнародных абавязацельстваў і грэблівае стаўленне да Пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах абражае Камітэт ААН і павінна быць даведзена да шырокай грамадскасці.

Па словах юрыста-праваабаронцы Рамана Кісляка, які падрыхтаваў для Камітэта ААН пакет дакументаў адносна двух асуджаных да смяротнага пакарання беларускіх грамадзян, - гэта сапраўды скандал.

*"Па сутнасці, Рэспубліка Беларусь кінула выклік Камітэту па правах чалавека, міжнароднай супольнасці ў плане выканання сваіх абавязкаў. З боку сусветнай супольнасці будзе рэакцыя на такія паводзіны дзяржавы",* — адзначыў праваабаронца.

На думку Рамана Кісляка, гэта далёка не лепшым чынам адаб'ецца на іміджы Беларусі.

Нагадаем, што ў сярэдзіне сакавіка 2010 года, паводле даных праваабарончай арганізацыі "Міжнародная амністыя", у Беларусі былі расстраляныя 25-гадовы Андрэй Жук і 30-гадовы Васіль Юзэпчук. Першы быў прызнаны вінаватым у разбойным нападзе і забойстве супрацоўніка СВК "Бальшавік-Агра", які перавозіў грошы для выплаты заробку працоўным сельгаспрадпрыемства. Другога прысудзілі да вышэйшай меры пакарання за здзяйсненне серыі забойстваў пажылых жанчын у Брэсцкай вобласці.

## Новы праваслаўны епіскап з'явіўся ў Беларусі

Епіскапам Барысаўскім, вікарыем Мінскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы стаў Веніямін (Тупека). Дагэтуль ён займаў пасаду намесніка Дабравешчанскага мужчынскага кляштара ў Лядах Смалявіцкага раёна.

Рэзідэнцыя епіскапа будзе знаходзіцца ў Лядзенскім кляштары. Веніямін будзе дапамагаць у кіраванні Мінскай епархіяй — самай буйной у Беларускай праваслаўнай царкве.

Зараз у БПЦ дзейнічаюць 14 епіскапаў: 11 епархіяльных і 3 вікарных.

## Без перасеву не абысціся

У Беларусі неабходна перасеяць 30% азімага рапсу. Гэта ў тры разы больш, чым звычайна, распавёў падчас прэс-канферэнцыі ў Мінску супрацоўнік Акадэміі навук Беларусі **Міхаіл Кадыраў**.

Адмыслоўца адзначыў, што ў Беларусі азімы рапс "традыцыйна вымярзае на 40% плошчаў". Але штогод перасейваецца не больш за 10% гэтай сельскагаспадарчай культуры.

Нягледзячы ні на што, рэнтабельнасць азімага рапсу летась склала 19%. Гэта адзін з самых высокіх паказчыкаў сярод сельскагаспадарчых культур.

СОРАМ!

# Штраф за... баявыя заслугі



Громам сярод яснага дня было для шматлікіх састарэлых жыхароў заходніх раёнаў Віцебшчыны атрыманае ў лютым бягучага года паведамленне з падатковай інспекцыі з патрабаваннем заплаціць пэўную суму за тое, што летась атрымлівалі з Польшчы грошы ў якасці дапамогі, прызначанай за ўдзел у вызваленні суседняй краіны ад нямецка-фашысцкіх акупантаў.

Як абразу ўспрыняў гэтую навіну 88-гадовы Пётр Ягоравіч Бабіч з вёскі Амбросенкі Шаркаўшчынскага раёна. За тое, што ваяваў апошнія два гады вайны з Германіяй у складзе Войска Польскага, а ў 2009 годзе атрымліваў праз банк дапамогу ад урада Польшчы, яму, аказваецца, трэба заплаціць каля 250 тысяч рублёў падатку. У параўнанні з атрыманай з Польшчы за год сумай (на квартал выходзіла па 150 еўра) спагнанне быццам бы і не надта вялікае, але для пенсіянера ўсё ж адчувальнае. А галоўнае — крыўднае, бо гэты нечаканы падатак, налічаны незадоўга да юбілею Перамогі, выглядае здзекам, пакараннем за ўдзел у барацьбе супраць агульнага ворага.

— Я ж не сам пайшоў у Войска Польскае, — узгадвае далёкую маладосць ветэран. — Калі ў 1944 годзе ў вызваленым ад фашыстаў раёне савецкія войскі праводзілі мабілізацыю, нас, вясковых хлопцаў, спыталі, ці ведае хто польскую мову, і кожнага, хто ведаў, накіравалі ў падраздзяленні Войска Польскага, якое, па ўсім відаць, стваралася для сумесных дзеянняў з Савецкай Арміяй. І дапамогі той з Польшчы я не прасіў, а паколькі ўжо яе пачалі дасылаць, адмаўляцца было і няёмка, і неразумна. Ды і не я адзін яе атрымліваў.

Сапраўды, шмат хто з аднагодкаў Пятра Бабіча, даведаўшыся аб неабходнасці выплаты падатку на дапамогу з-за мяжы, адчуў сябе пакрыўджаным.

А справа ў тым, што летась, як і колькі гадоў раней, у адпаведнасці з рашэннем польскага ўрада шэраг грамадзян Беларусі, якія ў час вайны з гітлераўскай Германіяй змагаліся ў складзе Войска Польскага, былі прыроўненыя да ветэранаў-палякаў і штоквартальна атрымлівалі з суседняй дзяржавы каля 150 еўра як дадатак да пенсіі. Такім чынам Польшча дзякавала нашым суайчыннікам за іхні ўнёсак у вызваленне польскага народа ад фашызму.

У ліку вызваліцеляў Польшчы быў і зараз 87-гадовы Гедэон Майсеевіч Шык з вёскі Крупкі Пастаўскага раёна. І яго, як і вышэйзгаданага П.Бабіча, залічылі ў Войска Польскае савецкія камандзіры пры мабілізацыі ў 1944 годзе, і ён за 2009 год атрымаў праз банк пэўную суму польскай дапамогі. Патрабавання аб выплаце падатку ён, праўда, яшчэ не атрымаў, але ўжо чуў пра яго і, зразумела, здзівіўся і пакрыўдзіўся.

Абурыла гэтая навіна і блізкіх Гедэона Майсеевіча:

— Мой бацька сумленна прайшоў вайну, — гаворыць сын ветэрана Генадзь Гедэонавіч. — Ён афіцыйна прызнаны ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны, а пасля, у мірны час, страціў на працы руку, атрымаў групу інваліднасці. І калі цяпер з яго запатрабуюць падатак на дасланую з Польшчы дапамогу, гэта будзе проста здзекам са старога, хворага чалавека, які ў 1944 годзе, прысягнуўшы на вернасць Савецкаму Саюзу, годна выконваў свой абавязак у баях за свабоду Беларусі і Польшчы. Браць з яго падатак за прыбаўку да пенсіі, атрыманую з-за мяжы, лічу абсурдам. Калі ў дзяржаўнай казне мала грошай на грандыёзную рэканструкцыю Мінска, Віцебска ды іншых буйных гарадоў, то няхай бы ўлада скіравала ўвагу на празмерныя даходы асобных "новых беларусаў", на раскрадальнікаў дзяржаўнай маёмасці, на занадта вялікія пенсіі былых дэпутатаў Нацыянальнага сходу, якія нічога карыснага не зрабілі для народа. А не карала б недарэчным падаткам ветэранаў вайны, якія заслужылі больш паважлівых адносін да сябе.

Абсалютная большасць беларусаў, якія цяпер павінны плаціць падатак з "польскіх" грошай, пачыналі свой баявы шлях у першай польскай дывізіі імя Т.Касцюшкі, якая ўваходзіла ў склад Савецкай Арміі, а потым зрабілася падмуркам для стварэння Войска Польскага. Шмат хто з нашых землякоў разам з польскімі братамі па зброі дайшоў з баямі да Варшавы, а затым браў Берлін. Усе яны справядліва лічацца ветэранамі вайны і маюць права на льготы, прызначаныя для гэтай катэгорыі грамадзян. І тое, што яны пэўны час былі ў вайсковых шэрагах суседняй дзяржавай, ніколі не ставілася ім у віну, гэтак жа, як нікога не турбавалі дасюль дасылаемыя ім з Польшчы грашовыя пераводы.

І раптам — патрабаванне "аб выплаце падатку на дапамогу, атрыманую ў 2009 годзе".

— Вось дык падаруначак ад роднай дзяржавы незадоўга да 65-годдзя Перамогі! — абураюцца Пятро Бабіч, Гедэон Шык ды іншыя ветэраны Другой сусветнай вайны.

Абурае гэта і іх сямейнікаў, якія міжволі бачаць у крыўднай для старых сітуацыі палітычную падаплёку.

— Чамусьці раней пра падатак нічога не гаварылі, а цяпер узгадалі, — разважае Генадзь Шык. — Лічу, што гэта тлумачыцца беларуска-польскім канфліктам з нагоды непаразуменняў вакол Саюза палякаў Беларусі. Але ж тады гэта яшчэ больш абсурдна! Мой бацька — не паляк, а патомны беларус, палітыкай ніколі не займаўся, у Саюзе палякаў Беларусі не быў. Ва ўмовах амаль нязноснай дарагоўлі прадуктаў і тавараў проста сорамна браць падатак з невялікай, цалкам заслужанай і законнай дапамогі, атрыманай ад суседняй дзяржавы.

— Крыўду былых ваяроў за волю Польшчы лёгка зразумець, — зазначае намеснік начальніка падатковай інспекцыі Пастаўскага раёна Алена Уладзіміраўна Кукель, — бо гэтыя людзі не вінаватыя, што ім дасылалі з-за мяжы нейкі дадатак да пенсіі. Такіх, як Бабіч, і ў Шаркаўшчынскім раёне, і ў нас, на Пастаўшчыне, шмат. На вялікі жаль, падатак на ўсе грашовыя пераводы з-за мяжы бярэцца ў адпаведнасці з дзеючым беларускім заканадаўствам, якое мы не можам змяніць, хоць і бачым ягонае разыходжанне з логікай і маральнасцю. Дарэчы, хібы ў ім бачым не толькі мы. Ужо вядома, што, пачынаючы з наступнага года, ад падаткаў на даходы, атрыманыя з-за мяжы, будуць вызваляцца ўсе, чые паступленні, атрыманыя з іншых краін, за год не перавышаюць 17,5 мільёна рублёў. Але гэтая норма на 2009 год не распаўсюджваецца. Вось чаму наша інспекцыя была вымушана, гэтак жа, як і Шаркаўшчынская, і ўсе іншыя, нагадаць мясцовым ветэранам Войска Польскага, якія адначасова з'яўляюцца ветэранамі і Вялікай Айчыннай, аб неабходнасці ўнясення замежнага дадатку да пенсіі, атрыманага летась, у дэкларацыю аб даходах з выплатай належнага падатку з гэтай сумы.

Гэты фіскальны захад узрушае і крыўдзіць не толькі былых вызваліцеляў Польшчы, а і колішніх вязняў ГУЛАГу, якія летась атрымлівалі грашовую дапамогу з фонду Салжаніцына. Так, пастаўчанка Антаніна Уладзіміраўна Аксенцьева, якая доўгі час бязвінна пакутавала ў сталінскіх лагерах, а пасля была рэабілітавана, летась атрымала са згаданага фонду невялікую адпаведную разавую дапамогу, за што цяпер, у адпаведнасці з нашым законам, павінна выплаціць каля 50 тысяч рублёў падатку. Праўда, з яе, улічваючы расійскую прапіску фонду, што даслаў ёй грошы, і наяўнасць беларуска-расійскай саюзнай дзяржавы, падатак хутчэй за ўсё можна і не браць. А вось з польскай дапамогі ўзяць, як ні шкада, прыйдзецца, хоць, шчыра кажучы, рабіць гэта нам дужа не хочацца. І таму мы вырашылі не нагадваць пра падатак усім ветэранам, а крыху счакаць: а раптам наверсе адумаюцца і скасуюць гэты падатак з улікам блізкага юбілею Перамогі? А яшчэ мы падсумавалі і задакументавалі скаргі ветэранаў на гэты падатак, і будзем накіроўваць іх у райфінаддзел, каб той (а такая дамоўленасць з кіраўніцтвам аддзела ёсць) перадаў гэтае пякучае пытанне на разгляд сесіі раённага Савета. І мы, у нашай інспекцыі, і супрацоўнікі фінансавага аддзела ўпэўнены, што дэпутаты аднадушна прагаласуюць за скасаванне крыўднага для ветэранаў падатку на мясцовым узроўні. Гэта будзе разумна і справядліва, бо людзі, пра настрой якіх мы зараз паруліся, заслугоўваюць таго, каб сустрэць 65-годдзе Перамогі без крыўды на дзяржаву.

Уласна кажучы, да гэтых слоў Алены Уладзіміраўны і дадаць няма чаго — настолькі яны мудрыя і дакладныя. Хіба што варта распавесці пра тое, чым завяршыўся візіт сына згаданага раней Пятра Бабіча ў падатковую інспекцыю Шаркаўшчынскага раёна, куды ён хадзіў па бацькавай просьбе, каб разабрацца наконт нечаканага падатку.

Вось што распавёў Васіль Пятровіч:

— На маё здзіўленне і абурэнне з нагоды раптоўнага 250-тысячнага спагнання з амаль 90-гадовага старога мне паказалі цэлы стос уласнаручных скаргаў, падпісаных гэткімі ж пакрыўджанымі ветэранамі, як і мой бацька. З адным я паразмаўляў там, у інспекцыі, і ён сказаў, што нашаму прэзідэнту пашанцавала сустрэцца ў Кіеве з міністрам замежных спраў Польшчы Радаславам Сікорскім да таго, як Варшава даведалася пра ганебны падатак з беларускіх удзельнікаў вызвалення Еўропы. А то давялося б Аляксандру Рыгоравічу паспешліва шукаць прыстойны адказ і на гэтае непрыемнае пытанне. Скаргі ветэранаў нашага раёна, скіраваныя на імя старшыні райвыканкама, былі складзены паводле адной формы. Супрацоўнікі інспекцыі прапанавалі і мне напісаць гэткую ж заяву. І запэўнілі, што, наколькі ім вядома, рэзалюцыя старшыні будзе станоўчая — аб скасаванні падатку, бо і сам кіраўнік раёна, і ўсе іншыя райвыканкамаўцы лічаць падатак з мясцовых ветэранаў Войска Польскага недарэчнасцю.

Ну што тут скажаш? Калі спушчаныя зверху законы і ўказы гнілыя, ганебныя, недэмакратычныя па сутнасці сваёй, то яны адвяргаюцца знізу і разбураюцца, бо альбо самі расхістваюцца, альбо іх расхістваюць абураныя імі людзі, у тым ліку — нават чыноўнікі, абавязаныя сачыць за іх выкананнем.

**Сяргей БУТКЕВІЧ.**

ВАС ЧАКАЮЦЬ...

## Пад знакам «Пагоні»

Выстава творчай суполкі "Пагоня", прымеркаваная да чарговай гадавіны Беларускай Народнай Рэспублікі, адкрылася ў Мінску на сядзібе БНФ "Адраджэньне" (пр.Машэрава,8).

Тут прадстаўляюць свае творы Аляксей Марачкін, Мікола Купава, Уладзімір Сулкоўскі, Алесь Пашкевіч, Валер Шчасны, Янка Рамановіч і іншыя мастакі, якія пішуць у фарбах гісторыю Бацькаўшчыны.

Тут можна ўбачыць і партрэт нашага слыннага творцы, змагара-адраджэнца, аднаго з арганізатараў БНФ Яўгена Куліка з нашым гістарычным сцягам у руках, а таксама акварэль самога Яўгена Сяргеевіча "Нясвіжскі замак".

Мікола Купава паказвае партрэт Вялікага гетмана ВКЛ Канстанціна Астрожскага і каляровыя літаграфіі "Наша Доля" і "Друкарня Марціна Кухты ў Вільні". Уражвае партрэт маладога Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча пэндзля Ю.Несцерука.

Прыцягваюць увагу эпічныя краявіды В.Сташчанюка і кампазіцыі іншых мастакоў. Гледачы ўбачаць яшчэ шмат цікавага, наведаўшы выставу, якая будзе працаваць да 18 красавіка.

Другая выстава суполкі "Пагоня" разгорнута ў гасцёўні Мар'яна Місевіча ў мястэчку Падсвілле Глыбоцкага раёна. Жыхарам глыбінкі таксама цікава пазнаёміцца з сучаснымі творамі выяўленчага мастацтва...

**Кастусь МІКАЛАЕЎ.**

СТРАШНА!

## Вар'ят у Магілёве

Магілёў жыве страшнымі чуткамі аб з'яўленні ў горадзе маньяка.

Так, на мінулым тыдні Генеральная пракуратура Беларусі пацвердзіла, што ў Магілёве быў знойдзены рассечаны труп жанчыны. *"Цела без галавы, рук і ног было выяўлена днём 23 сакавіка каля моста праз раку Дняпро. Труп быў загорнуты ў покрыва"*, — адзначыла Генпракуратура. Як паведамлялася, супрацоўнікі праваахоўных органаў адразу ўзбудзілі крымінальную справу.

І вось другая падобная навіна з таго ж Магілёва.

Пра тое, што ў горадзе знойдзены парэшткі яшчэ аднаго чалавечага цела, тэлерадыёкампаніі "Магілёў" распавёў начальнік следчага аддзела пракуратуры Магілёўскай вобласці Сяргей Катрыч.

Рэшткі чалавечага цела знайшлі паблізу месца папярэдняга злачынства — у двары дома па вуліцы Фаціна, таму міліцыя звязвае гэтыя дзве справы. Ну а ўжо як іх звязвае народная пагалоска, можаце здагадацца.

УЗЕЛОК НА ПАМЯТЬ

## Штрафы, которые водитель теперь может заплатить сотруднику ГАИ на месте нарушения

| За что? | Сколько? |
|---|---|
| За превышение скорости от 10 до 20 км/ч | Штраф до 1 б.в. (до 35 тыс.руб.) |
| За превышение скорости от 20 до 30 км/ч | Штраф от 1 до 2 б.в. (от 35 до 70 тыс.руб.) |
| За непристегнутый ремень безопасности водителем или пассажиром | Штраф до 1 б.в. (до 35 тыс.руб.) |
| За разговор по мобильному во время движения | Штраф до 2 б.в. (до 70 тыс.руб.) |
| Если номер на авто нестандартен, запятнан грязью или установлен с нарушениями | Штраф до 2 б.в. (до 70 тыс.руб.) |
| За забытое водительское удостоверение | Штраф до 2 б.в. (до 70 тыс.руб.) |
| За то, что авто не зарегистрировано в ГАИ, за непройденный вовремя техосмотр | Штраф до 2 б.в. (до 70 тыс.руб.) |




## Падвялі апетыты

Да трох з паловай гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці суд Цэнтральнага раёна Мінска прыгаварыў былога генеральнага дырэктара ААТ "Смаргонскі завод аптычнага станкабудавання" (Гродзенская вобласць).

Як паведамілі БелаПАН у пракуратуры Цэнтральнага раёна сталіцы, былы кіраўнік прызнаны вінаватым ва ўчыненні злачынства, прадугледжанага ч.2 арт.430 КК (атрыманне хабару).

Ён быў затрыманы ў сярэдзіне снежня 2009 года. Абвінавачваўся, у прыватнасці, у тым, што за спрыяльнае вырашэнне пытання аб заніжэнні кошту выкананых работ па распрацоўцы і вытворчасці абсталявання атрымаў ад камерцыйнага дырэктара сталічнай фірмы 6 тыс. долараў ЗША.

## З дурнем не сыходзься, бо не развядзешся

Пракуратура Баранавіцкага раёна расследуе крымінальную справу ў дачыненні да мясцовага жыхара, які абліў бензінам і падпаліў былую жонку.

Як паведамілі БелаПАН у пракуратуры, у справе, распачатай пракуратурай на падставе артыкулаў КК "Замах на злачынства" і "Замах на забойства", фігуруе 53-гадовы жыхар вёскі Зорная. Паводле звестак следства, у кватэры па месцы жыхарства падчас сваркі са сваёй былой жонкай ён абліў яе бензінам і падпаліў. 49-гадовая жанчына шпіталізавана ў Баранавіцкую гарадскую бальніцу. У яе апёкі 10% паверхні цела. Зараз стан пацярпелай здавальняючы. Мужчына затрыманы і знаходзіцца ў следчым ізалятары. Былыя муж і жонка скасавалі шлюб сёлета, жывуць у адной кватэры.

ПОСТСКРИПТУМ

# Минск бьет по Москве из всех мегафонов

Самое любопытное заявление на акции, проведенной 25 марта по случаю очередной годовщины провозглашения Белорусской Народной Республики, прозвучало, как ни странно, из уст высокопоставленного милицейского чиновника. Мегафонная аудиопрофилактика — вроде обыденная вещь для оппозиционных акций. Но в постное блюдо традиционных предупреждений добавили изрядную долю перца.

*"У нас есть информация, что группа российских граждан может совершить провокации наподобие той, которая произошла 3 июля 2008 года",* — выдал в мегафон оперативную информацию начальник минской милиции Леонид Фармагей.

Угроза взрыва — это сигнал, который правоохранительные органы не имеют права игнорировать, если даже он исходит от картавого пятиклассника и априори ложен. Надо отметить, что еще днем площадку перед зданием Академии наук, где был назначен сбор участников акции, проверяли на наличие потенциально опасных предметов, даже с собаками. Да и после того, как митингующие разошлись, милиция проводила своего рода "зачистку" района — опять-таки на предмет подозрительных предметов, к примеру, оставленных под кустом пакетов из-под сока.

Конечно, можно предположить, что свежее предупреждение Фармагея — очередная страшилка для обывателя, попытка еще крепче вбить в массовое сознание все повешенные на белорусскую оппозицию грехи: от национализма до терроризма. Да мало ли подобных страшилок было раньше? Пугали и дохлыми крысами в водопроводе, и даже грузинскими боевиками.

Но нынешнее заявление как-то выбивается из общего ряда. В первую очередь тем, что в качестве носителей угрозы называются граждане России. Да и сама формулировка предупреждения читается двояко. С одной стороны, получается, что граждане России могут устроить взрыв, наподобие того, который произошел на День независимости. Но с другой — что, тот взрыв 4 июля 2008 года тоже был делом рук россиян?



Такая версия взрыва, кстати, по горячим следам расследования проскальзывала — мол, некий российский бизнес так немилосердно отплатил за нанесенные ему в Беларуси обиды. Получила ли эта версия развитие в плане расследования теракта, не известно. Но очень похоже, что ей дали "добро" на использование в иных целях.

Минск с Кремлем сегодня откровенно на ножах. Тесные экономические связи в рамках многочисленных интеграционных проектов оказались не стабилизирующим отношения фактором, а жгутом, пережавшим все нормальные каналы для коммуникаций. Лишение Беларуси статуса нефтяного оффшора сильно ударило по позициям белорусского лидера накануне кампании по легитимизации очередного президентского срока. В первую очередь пострадало реноме Лукашенко как политика, имеющего какой-то вес в Москве. Точнее, имевшего. Посмотрите российское телевидение, почитайте тамошние газеты — в них белорусский президент уже давно отображается именно так, как видят его нынче в Кремле.

Но с другой стороны, в этом для белорусской власти есть и плюс — теперь совершенно очевидным стал объект, на который можно свалить всю вину за ухудшение экономического положения, за невыполненные обещания по росту благосостояния народа, за... Да хоть за всё, в том числе и за так до сих пор не раскрытый взрыв на День независимости. Осталось лишь для усиления эффекта принудительно дактилоскопировать всех проживающих у нас и приезжающих в гости граждан России.

*"Белорусские новости".*

ГАРДЕРОБЧИК

# Белорусская мода: «продукт», но не «произведение»!

*Редкий в торговле случай, когда руками потрогать можно, а вот купить нельзя, могли наблюдать все посетители выставки-ярмарки "Белтекслегпром. Весна".*

*Многообразие продукции легкой промышленности было доступно только оптовым покупателям. Остальным оставалось только смотреть и делать выводы.*

## Ловись, покупатель...

Выставка-ярмарка "Белтекслегпром. Весна" традиционно прошла в минском выставочном центре "БелЭкспо". Тех, кто пришел на выставку в надежде пополнить свой гардероб новинками от белорусских и зарубежных производителей, ждало разочарование. Розничная торговля хоть и была разрешена на втором этаже выставочного комплекса "БелЭкспо", но большого количества продавцов не привлекла. Такие ярмарки, как "Белтекслегпром. Весна", ориентированы на другую аудиторию.

— *Это крупнейший межотраслевой деловой форум — основное место для изучения ассортимента, технологий, конкурентной среды, качества и дизайна,* — сказал на открытии выставки первый заместитель председателя концерна "Беллегпром" **Владимир Астровский**.

## Тяжела жизнь модели

Вынуждена расстроить тех, кто ждет сообщений, что отечественный производитель наконец-то взялся за голову, выкинул журнал "Бурда" с выкройками за 1986 год и открыл новую веху в индустрии моды Беларуси. На этот раз чуда, к сожалению, не произошло. Складывается впечатление, что Беларусь не только строит особую экономическую модель, но и исповедует законы моды, не известные остальному прогрессивному человечеству.

Китами, на которых держится белорусская мода, были и остаются лен и... неописуемые фасоны. Цветовая гамма тоже не дает пройти мимо. Чего стоят хотя бы белые платья в огромные черные горошины и спортивные костюмы цвета фуксии.

Преподаватель одного из каирских университетов Амина Захер подала иск в суд с требованием развести ее с мужем из-за его пристрастия к фулю — блюду из тушеной фасоли, которую в Египте принято считать "едой бедняков", сообщает агентство EGYnews. Привязанность супруга к уличным ларькам на колесах, предлагающим фуль бедным прохожим, стало решающей причиной для решения женщины.

По словам египтянки, ее муж, также преподающий в одном из столичных вузов, каждое утро уходит из дома без завтрака и принимает пищу вместе с бедняками в ближайшей фулевой лавочке.

Женщина утверждает, что не может смириться с таким поведением супруга, поскольку сама принадлежит к благородной семье. Более того, как утверждает Амина, из-за пристрастия к "еде бедняков" ее супруг не смог получить в университете положенную ему научную степень.

Вызванный в суд любитель фуля заявил, что он "завтракает как простой гражданин Египта, а не как профессор университета". Он также пояснил суду, что очень любит жену, но не готов расстаться со своими привычками из-за ее капризов.

Судья попытался примирить семейную пару, однако разгневанная женщина настояла на разводе.

## Славутаму сыну Беларусі — 100!

# Цярновы шлях

### *Аповяды Барыса Кіта, запісаныя Васілём Быкавым улетку 2001 года ў Франкфурце-на-Майне*

*(Працяг. Пачатак у №№48—49.)*

Што ж да Зыгмунда Бэчковіча, памятаю шмат цікавых момантаў адносна яго. Ён так хацеў, каб наша Наваградзкая гімназія была лепшай, прыходзіў да нас на лекцыі. Між іншым, часта мяне выклікалі да дошкі, бо я быў найлепшым матэматыкам. Пазьней ён даваў стыпендыі найлепшым вучням, дзяржаўны статус найлепшым настаўнікам. Гэта яшчэ да атрыманьня дзяржаўных правоў. Калі ж былі атрыманы дзяржаўныя правы, тады ўсе настаўнікі займелі добрую пэнсію. Увогуле, у Польшчы школьніцтва стаяла на вельмі высокім, прывілеяваным узроўні. Але толькі школьніцтва. Настаўнікі, як і іншыя працаўнікі, заўсёды атрымлівалі аванс. Калі аванс на іншых службах даваўся з выбарам, дык у школьніцтве — аўтаматычна ўсім. Звольніць настаўніка зь дзяржаўнай працы, як мяне, напрыклад, якога прасьледвалі за маю беларускую дзейнасьць, калі я меў поўнасьцю ўсталяваныя правы, школьная кураторыя ня мела права. Не зважаючы на ўсе мае палітычныя справы, школьная кураторыя не магла мяне звольніць. Па закону, каб звольніць усталяванага настаўніка, трэба было яму прыпісаць нейкую крымінальную справу, пасласць у міністэрства, і толькі міністэрства магло вырашыць, ці можна яго звольніць. За мной ніякай крымінальнай справы не было, а палітычных было шмат, дык мяне не маглі звольніць. Палітычная дзейнасьць зрабіла толькі тое, што мяне абвясцілі пэрсонай нон грата і не выпушчалі за мяжу. Я хацеў паехаць у Эўропу, запісаўся ў экскурсію настаўнікаў, якая мелася паехаць вакол усёй Эўропы, заплаціў грошы. Мяне зьбіраліся спатыкаць у Берліне нашыя беларускія дзеячы, такі Шкутка. Але я не прыехаў, бо ў апошнія дні прыйшла тэлеграма з губернатарства Віленскага: пану ня ёсьць дазволены выезд за мяжу. Гэта было вельмі сур'ёзна. Але вайна ўсё перавярнула. У 70-м годзе я прыехаў як прадстаўнік акадэміі навук Амэрыкі і выкладаў у Ягелонскім унівэрсытэце. Вось так. Яны мяне не пушчалі з Беларусі, і я езьдзіў па ўсім сьвеце з Амэрыкі.

Я быў рэпрэсаваны польскімі ўладамі, сядзеў у розных турмах — за Граматы ў Навагрудку, на Лукішках за справу Таварыства беларускай школы. На Лукішках сядзеў разам з Шырмам, які з Хворастам быў у суседняй камары. Хворост быў кіраўніком танцавальнай часткі ў Шырмы, быў страшэнна нэрвовы, ледзьве ня плакаў, хадзіў, крычаў, і я яму стукаў праз дзьверы: ціха ты, перастань. А мы з Хворастам некалі здавалі матуральныя дзяржаўныя экзамены. Ён разам з Шырмам выехаў у Менск, і там яны рабілі свае справы. Шырма быў вельмі прыемны чалавек. Вельмі добра ведаў я тады доктара Марцінчыка, памятаю яго беларускую дзейнасьць. А яго сястра Люба вучылася ў нашай гімназіі і стала доктарам мэдыцыны. Пасьля вайны яна выйшла замуж за беларуса Аляксандра Аўдзея, былога старшыню Стоўпцаўскага павету пры немцах, які скончыў палітэхніку ў Мюнхэне і застаўся ў Нямеччыне будаваць дамы. Яны жылі ўвесь час каля Штутгарта, але бедная Люба захварэла на рак сэлязёнкі. Я застаў яе перад самай яе сьмерцю ў Штутгарце, і яна сабрала ўсіх беларусаў, што жылі там, каб мяне прывітаць. Хутка пасьля і памерла. Была надзвычай добрым чалавекам. Вось якія выходзілі з нашай гімназіі патрыёты. Можа, і ня ўсе яны бралі ўдзел у грамадзкай працы, але ўсе любілі сваю Беларусь. Яны таксама матэрыяльна падтрымлівалі беларускую справу. У нас шмат было або мэдыкаў, або адвакатаў. Быў такі Глінскі, патрыёт, адвакат, старшыня Беларускага студэнцкага саюза. Я спаткаў яго на эміграцыі, у Лёндане. У эміграцыі мала каму з нашых беларусаў удалося зрабіць кар'еру, дык яны мусілі фізычна працаваць. Глінскі Канстанцін да канца жыцьця прадаваў білеты на мятро. Калі я прыязджаў у Лёндан, найперш ішоў да яго, і той дзівіўся: што-о, адкуль ты ўзяўся, Барыс? З Амэрыкі, кажу, прыехаў цябе адведаць. І мы пазьней спаткаліся ў розных выдатных мясцінах гораду.

Перад самай вайной польскія ўлады так прыціснулі нас за беларускую справу, што немагчыма было дыхаць. Мы, настаўнікі, скончыўшы адзін год, ня ведалі, ці пачнем другі. Так цяжка стала, што мы рашылі пажаліцца. І зрабілі беларускую дэлегацыю ў Варшаву — да паслоў у Сойме і ўлады. У гэтую дэлегацыю ўключылі Глінскага, мяне і Астроўскага. А на той час Зыгмунд Бэчковіч, які добра да мяне ставіўся, стаў ужо сэнатарам. Мы пайшлі да яго, каб ён нам дапамог пабачыць высокіх міністраў. А той кажа: "Мяне так адсунулі, што цяпер я для вас нічога ўжо зрабіць не магу". І мы пабачылі толькі ніжэйшых чыноўнікаў, сакратару Ванду Пэльчынскую, якая што-нішто паабяцала. Калі вярнуліся дахаты і кураторыя даведалася пра паездку, дык Астроўскага першага паслала ў Лодзь настаўнікам. І тое яго ўратавала. Бо як пачалася вайна, Лодзь падпала пад немцаў. А жонка яго засталася ў Вільні. Саветы арыштавалі яе і выслалі ў Казахстан. Пасьля Натальлю Арсеньеву вызвалілі з Казахстану, а Антаніну Астроўскую — не, і яна там памерла.

Перад самым нямецкім нападам на Польшчу прыйшоў загад перавесьці выкладаньне ў гімназіях на польскую мову. Але было ўжо позна, хоць улады гэтак сьпяшаліся. Пасьля прыходу Чырвонай Арміі ў нас шмат што зьмянілася. Замест Васіля Кавалевіча дырэктарам стаў я. Нас ахапіў незвычайны энтузіязм, здавалася, пачынаецца час спрыяньня беларушчыне. Мы разгарнулі гімназію ва-ўсю: тысяча вучняў, сто настаўнікаў, дзесяць інтэрнатаў. Моладзь Наваградчыны рынулася да нас вучыцца. Але тое трывала вельмі нядоўга. Прыйшла чутка, што Сталін аддае Вільню Літве, дзе зможа збудаваць вайсковыя базы. Мае вучні прыслалі дэлегацыю на чале з Лашэвічам. Выходзіла так, што нам трэба вяртацца дахаты, у Наваградак. Там я найперш зайшоў да кіраўніка абласнога школьнага адзьдзелу Арсенія Саўчанкі і распавёў яму ўсю гісторыю Наваградзкай гімназіі, як нас прыцясьнялі палякі. Гэта яго так усхвалявала, што ён сказаў: таварыш Кіт, ідзіце і рабіце ўсё, што палічыце патрэбным. Мы забралі назад свой будынак, адрамантавалі. Я паехаў у Вільню, забраў 80 працэнтаў усёй гімназіі і перавёз цягніком у Наваградак. Спадар Лашэвіч, які мне памагаў, захапіў яшчэ і аркестр, які прывёз у Наваградак. Дарэчы, гэты аркестр адыгрываў вялікую ролю ў нашай гімназіі, паднімаў наш дух, іграў па сьвятах, удзельнічаў у парадах. Першы раз у Навагрудку мы скарысталі яго ў дзень гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі, калі ён іграў на плошчы. З прамовай тады выступаў Лашэвіч. У сваёй прамове ён на польскі манер ужыў слова "жыды", што дужа не спадабалася савецкім кіраўнікам, і тыя зьвярталіся да мяне з пратэстам. А пасьля мой сябра па працы Панько на мяне данёс, што я ў Вільні рабіў вялікую беларускую нацыянальную працу, і мяне зьнялі з пасады дырэктара гімназіі. Але праз кароткі час той самы Саўчанка, абласны школьны кіраўнік, прызначыў мяне на болей высокую пасаду — інспэктара ўсіх школаў Баранавіцкай вобласьці.

Дарэчы будзе зазначыць, што мой былы вучань Аркадзь Лашэвіч быў вялікім руплівцам беларускае справы, калі пасьля вайны працаваў ваяводам у Беластоку. Праз гэта яго перавялі ў Варшаву.

Я некалі шмат езьдзіў па сьвеце і шмат дзе спатыкаў сваіх сяброў. Пра Глінскага ўжо казаў, а другі быў Барыс Суравы, які пры немцах служыў школьным інспэктарам Слонімскага павету. Дык ён быў кухарам у польскім рэстаране ў Лёндане. Калі я прыязджаў да яго, ён заўсёды хадзіў у шапцы, такой белай. Ён яшчэ жыве, а Глінскі памёр ужо.

Або вось лёс выдатнага беларускага пісьменьніка і драматурга Аляхновіча, які прабыў шмат год на Салаўках. Яшчэ да вайны яго выменялі на Браніслава Тарашкевіча. Тады Аляхновіч прыехаў у Вільню, напісаў славутую кнігу "У кіпцюрох ГПУ", якая разышлася па сьвеце ў дзесяці ці болей мовах. Я быў на сходзе, дзе ён распавядаў пра сваё зьняволеньне. А ў 39-м годзе, як прыйшлі саветы, Аляхновіч быў змушаны хавацца ў лесе, баючыся арышту. З прыходам немцаў пасяліўся ў Вільні. Але аднойчы да яго пастукаўся нехта, і калі гаспадар адчыніў дзьверы, той стрэліў у яго і забіў на вачох жонкі. Мы ўсе яго паважалі і любілі, асабліва ягоныя драматычныя п'есы, якія ставілі ў нашай гімназіі. Я браў удзел у тых спектаклях.

— Савецкі Саюз тады не даваў, а браў. Рэпарацыі і так далей.

— Во і добра, што браў, — нечакана пагаджаецца спадар Барыс. — Старызну пабраў, а на тое мейсца Амэрыка прывезла найноўшае. І Нямеччына паднялася з друзу.

То праўда. У гістарычным музэі на Ромеры месьцяцца вялізныя макеты разбуранага ў вайну Франкфурту. Жахліва. Гораду няма. Адны руіны, сярод якіх пракладзены сьцежкі-дарожкі для транспарту. А цяпер? Усё адноўлена. Стары, яшчэ з часоў Сьвяшчэннай Рымскай імпэрыі цэнтр дбайна рэканструяваны. Бы цацкі, шчыльненька стаяць на плошчы сярэднявечныя фахверкі, сьцены, агароджы... Брусчатка на плошчы ранейшая, яе зьберaглі, не залілі асфальтам. Дзіўна, што сярод руінаў ацалелі цэрквы, — зрэшты, гэта ўсюды загадка. Цэрквы выстаялі нават пасьля дывановых бамбовак — тут, і ўсюды. Ці не памагаў ім Бог? Цяпер усё, бы новенькае. Бы летась збудаванае.

А ў нас?

Тое праклятае пытаньне на Захадзе раз за разам стукае ў голаў, тузаецца ў душы — хоць ты не глядзі на наваколье ці забудзься на пакінутае дома. Параўнаньні міжволі выклікаюць благія пачуцьці, настройваюць на самаедзкі, крытычны да сябе лад. Хоць бы наглядзеўшыся на гэтую ўрбаністыку — старую ці мадэрновую, але аднолькава звабную і для пагляду, і для карыстаньня. Ня хочацца згадваць пра нашы струхлелыя драўляныя хаціны, зарослыя крапівой падмуркі пабураных цэркваў ды новыя сілікатныя аборы, амаль аднолькавыя для кароў і людзей.

— А ў нас — савецкае. Бо Сталін жа не прыняў плян Маршала. Для Сталіна ягоная камуністычная фанабэрыя была вышэй за лёс народу. Хоць бы і народу-пераможцу.

Фанабэрыя ці нянавісьць — тое зьмясьцілася ў адно, у паталягічную нянавісьць да Захаду, якому ён рыхтаваў сьпярша сусьветную рэвалюцыю, а затым атамную вайну. Было б што есьці, ён, напэўна, рушыў бы ад Бэрліну да Ля-Маншу, каб канчаткова вырашыць ненавісную праблему капіталізму. А разам і любага яму сацыялізму. Ды для пераможцаў не хапала хлеба. Зброі было навалам, а хлеб зьнік. Як было бяз хлеба рабіць сусьветную рэвалюцыю?

У кавярні тым часам пуставата, мы выбіраем сабе ўтульны куточак у канцы разгароджанай на адсекі залі. Але паступова заля пачынае напаўняцца — гэта ў банках-хмарачосах пачынаецца перапынак на абед. Ціха, без мітусьні банкаўскія клеркі рассаджваюцца за столікамі. То ў бальшыні маладыя людзі ў строгіх гарнітурах і з сур'ёзнымі тварамі. Піва яны ня п'юць, болей — ваду, хутка і моўчкі ядуць і па адным зьнікаюць, кіруючы да сваіх разумных кампутараў. Мы не сьпяшаемся, і кельнэр чакае — што будзем есьці? Але найперш — што будзем піць? Піва — о'кей. Але якое? Тут дзесяткі гатункаў піва. (Зноў няпростая праблема выбару.) Спадар Барыс прастадушна жартуе:

— Выбар піва — ня выбар прэзыдэнта. Тут трэба галаву мець, каб не спудлаваць, бо жывату ж адказваць. — І раптам рашуча загадвае:

— Цвай маль вейцэн-бір!

— Гросэ?

— Гросэ!

— Яволь! — згодна адгукаецца вышкалены, франтавата апрануты кельнэр, і праз хвіліну на стале паяўляюцца два перапоўненыя, зь пенай келіхі.

— Ну цяпер пагамонім...

## Аповяд другі

### *5 ліпеня, кавярня «Шнайдар»*

Другі раз мы абралі іншую дарогу — ад Гаўптвахэ ў бок вакзалу. Крыху збоч наперадзе высіліся гонкія слупы хмарачосаў Камерцбанку, Выставачнага комплексу, Дойчабанку ды іншых. Тут яны відаць адусюль, бы нязьменныя сымбалі нямецкай фінансавай магутнасьці, знак еднасьці з заакіянскім сябрам. Спадар Барыс заўважае маю цікаўнасьць.

— Уражвае, але? Уражвае... А ўсё чаму? Падобныя на нью-ёркскія. Тут шмат што падобнае на амэрыканскае. Хаця і сваё ня горшае. Але ж гэта Амэрыка стварыла пасьляваенную Нямеччыну. Так што дзякаваць Богу, што менавіта Амэрыка, а не, прыкладам, Савецкі Саюз.

**Вайна. Уцёкі ў Вільню. Уцёкі зь Вільні. Прытулак у мястэчку Лебедзеве. Няўдалая спроба. Дырэктар семінарыі ў Паставах. Арышт у дарозе. Жахлівы месяц у Глыбоцкай турме. Галоўная цэнтраля СД у Вялейцы. Паратоўца — Кастусь Касяк. Злачынная роля АК. Перакладчыца Аня Катковіч. Нямецкі дазвол на БЦР і СБМ. Колішняе будаўніцтва Наваградзкай гімназіі.**

— Другая сусьветная вайна, ці другая яе частка, калі немцы напалі на Савецкі Саюз, усіх нас захапіла раптоўна. Я тады знаходзіўся ў Вільні. А ў Вільню трапіў, уцёкшы з Беларусі. Калі я яшчэ быў школьным інспэктарам Баранавіцкай вобласьці, дык аднойчы дачуўся, што ў Навагрудку ладзіцца вялікае зборышча беларускіх пісьменьнікаў, прыехалі Янка Купала і Якуб Колас ды іншыя. Я хацеў зь імі спаткацца і прыехаў з Баранавічаў у Наваградак. Але перад тым, як пайсьці на сход, зайшоў да свайго старэйшага прыяцеля доктара Станіслава Станкевіча, які яшчэ працаваў настаўнікам у маёй гімназіі. І ён мне сказаў: "Барыс, дрэнная справа. Як цябе перамясьцілі з Наваградка ў Баранавічы, дык НКВД усіх нашых настаўнікаў паклікаў і пытаўся, што ты рабіў за часам польскім у Вільні? Разам з Астроўскім і гэтак далей. Так выглядае, што табе трэба нешта рабіць, можа, выехаць куды з Баранавічаў". Я тады вырашыў паехаць у Вільню. Праз якіх два тыдні пачалася вайна.

Аднойчы, калі мы з прыяцелем Кавалевічам — былым дырэктарам Віленскай беларускай гімназіі — гулялі па горадзе, пачаліся алярмы, як нам падалося, — пробныя. Але я зірнуў на неба і пабачыў "месершміта". Не, кажу, гэта ня пробныя. Гэта паветраны напад. У першы ж дзень быў зьнішчаны віленскі аэрадром Парубанак. Пачаліся жахлівыя бамбардыроўкі Вільні, і я вырашыў пакінуць яе. Тады ж вечарам вырашыў дабірацца да Баранавіч, дзе была мая жонка. Яшчэ патрапіў даехаць цягніком да Ліды, а ўжо ад Ліды пехатой, каб узяць сваю жонку і недзе хавацца. Немцы нас перахапілі, як я зь цяжарнай жонкай ішлі з Баранавічаў, дагналі нас у Сталовічах, дзе яны стралялі ва ўсіх падворках. Мы схаваліся ў гумне і сядзелі там тры дні і тры начы. Немцы так хутка ішлі наперад, што пакінулі ззаду цэлыя арміі. Атрымлівалася так, што ўдзень ідуць немцы, а ўначы — савецкія войскі. Канавы, узбочыны — усё было завалена цяжкой савецкай зброяй. Калі мы праходзілі праз Карэлічы, я раптам спаткаўся з адным сваім знаёмым, Друцькам, той быў на кані, аказваецца, ён ужо камендант паліцыі. Убачыўшы мяне, ён аж закрычаў: "Барыс, адкуль ты? Мы цябе шукаем, каб расстраляць. Уцякай хутчэй!" Ён і яшчэ ўратаваў аднаго — Дыдышку, якога загадаў скінуць з грузавіка, калі яго вязьлі на расстрэл. Той пасьля скончыў кансэрваторыю і цяпер жыве ў Менску. А Друцька зьнік.

Прыйшлі ў Лебедзева, дзе я доўгі час сядзеў на печы, хаваўся. Тады я дачуўся, што немцы, заняўшы Баранавічы, расстрэльвалі нашых школьных інспэктароў. Расстралялі і аднаго вячэрняга інспэктара, Генрыха Дэмбінскага, выдатнага польскага сацыялістычнага дзеяча. А пазьней пачалося будаўніцтва беларускага школьніцтва. Беларускі актыў стаў наракаць, што я сяджу, нічога не раблю. Ксёндз Гадлеўскі, які тады быў галоўным школьным інспэктарам усяе Беларусі (пазьней яго расстралялі немцы), паводле чутак, казаў: што гэты Кіт сядзіць там на печы, пара ўжо яму вылазіць адтуль. Тады я паехаў у Маладэчна, дамовіўся са школьным інспэктарам.

Далейшыя мае падзеі ўжо вядомыя, бо былі апісаныя... Тады я і вырашыў заснаваць у Маладэчне беларускую настаўніцкую семінарыю. Дарэчы сказаць, што ўсе школы, дзе я калісь працаваў ці арганізоўваў іх, былі чыста беларускія. Мяне зацікавіла маладэчанская традыцыя, бо там яшчэ за царскім часам існавала настаўніцкая семінарыя, што было важна. Беларусы таму спрыялі, асабліва школьны інспэктар Маладэчанскага раёна спадар Яворскі, які і дагэтуль жыве, сядзіць у Сібіры, куды ён быў сасланы пасьля вайны. Ён быў надзвычай цудоўны беларускі патрыёт і пачаў са мною беларускае школьніцтва на Маладэчне. Каб атрымаць дазвол, нам даводзілася езьдзіць у Менск, у школьны адзьдзел генеральнага камісарыяту, там быў нямецкі начальнік Сівіца, а ягоны заступнік — беларус доктар Яхім Скурат. Скурат быў мой калега па Віленскаму ўнівэрсытэту, я зь ім сябраваў, і ён памагаў мне. Мы ўгаварылі немца Сівіцу даць нам дазвол адчыніць беларускую настаўніцкую семінарыю. З гэтым дазволам мы ўсьцешаныя прыехалі ў Маладэчна, і я разгарнуў усю справу. Атрымалі асобны дом, надрукавалі афішы. На працягу некалькіх дзён запісалася 300 чалавек моладзі. Але хутка ўсё зьнікла. Мы ня ведалі, што, апроч Менску, трэба яшчэ атрымаць дазвол ад нямецкага гебітскамісара Шмідта ў Вялейцы. Як ён даведаўся, што я без ягонага дазволу адчыніў семінарыю, дык так зазлаваў і на сваёй машыне прыехаў у Маладэчна. Найперш зачыніў друкарню, дзе друкаваліся афішкі, і шукаў мяне, каб арыштаваць. Тады я паехаў у Менск да спадара Скурата і таго ж Сівіцы, а яны: "Ну што ж, мы цябе пашлем у другое мейсца". І паслалі мяне ў Паставы таксама дырэктарам беларускай настаўніцкай семінарыі, якая ўжо была адчыненая. Яе адчыніў школьны інспэктар і мой калега Пятро Шчасны. Там на мяне гневаліся, бо я парушыў нямецкі закон, каб не прымаць у беларускую школу дзяцей іншых нацыянальнасьцяў, напрыклад, палякаў. Я паціху прымаў іх, бо мне было іх шкада. Дык мяне за тое крытыкаваў Шчасны, нават пагражаў.

Аднойчы, як я ехаў да свае хаты ў Лебедзеве, мяне арыштавалі і пасадзілі ў турму. 30 дзён я сядзеў у Глыбокім. Мяне абвінавачвалі, што я нібыта маю сувязь з партызанамі, што я англа-амэрыканскі шпіён і г. д. Умовы ў турме былі страшэнныя — на дварэ сьцюжа, а ў склепе стаяла адна печка, якая заўсёды капціла. Я накрываўся кажухом, каб зьберагчы вочы. Завяліся вошы. Кожную ноч чакаў сьмерці. Нас было там чалавек 30, дык кожную ноч расстрэльвалі чалавек 25, на наступны дзень зноў нагоняць і зноў бальшыню расстраляюць уначы. І так цягам месяца. Мне шчасьціла заставацца ў ліку тых пяці. Кожную ноч заходзіць нямецкі жандар і пачынае зачытваць прозьвішчы, а як даходзіць да К, дык пачынае цьвеліць: кі, кі... Усе мы там баяліся сьмерці, уначы расказвалі адзін аднаму розныя аповяды. І я разам зь іншымі думаў, што, можа, гэта апошні мой дзень. Сядзела шмат беларусаў, сялянаў. Памятаю аднаго, які са мной вельмі дружыў, пазьней яго расстралялі, ён расказваў, як яго арыштавалі. "Мая вёска была блізка ля чыгункі, дык уначы зімою прыйшлі партызаны, сабраліся ў маёй хаце, пасьля пайшлі на чыгунку і падклалі міну, ну і ўзарвалі цягнік. А раніцай прыйшлі немцы, бо на сьнезе ўбачылі сьлед ад чыгункі аж да маёй хаты, і арыштавалі мяне. І вось я з вамі тут сяджу і чакаю сьмерці". Такіх людзей там было шмат. Памятаецца мне адзін настаўнік, сядзеў таксама за сувязь з партызанамі. Наогул там працэнтаў, можа, 80 сядзела за сувязь з партызанамі. А вось яшчэ адзін такі, усё мне распавёў. Кажа, яшчэ адна ноч мінула, але я адчуваю, што памру. А ў яго такія прыгожыя боты, халявы такія новыя, кажа: забярыце іх. А я яму: што вы, яшчэ будзеце жыць. Ды ён не паверыў і ў сваіх ботах халявы парэзаў. І праўда, прыйшла ноч, узялі 25 чалавек і яго таксама. А пасьля назад везьлі толькі вопратку. Паглядзеў я праз вакно і бачу: вялізны воз вопраткі, а наверсе ягоныя боты з парэзанымі халявамі.

На той час ужо працавала Беларуская цэнтральная рада ў Менску, і там даведаліся, што я сяджу ў Глыбокім. Яны баранілі сваіх людзей. А ў Глыбокім быў прадстаўнік БЦР Нікандра Мядзейка. Ён дамогся, каб мяне перавялі ў галоўную цэнтралю СД у Вялейцы. Цягніком мяне, скутага, прывезьлі ў Вялейку. Пачалося новае зьняволеньне. Кінулі мяне ў камару, бачу, уся падлога занятая людзкімі целамі, няма куды ступіць. Нехта падняўся, пытаецца: "А ты вошы нам прывёз ці не?" Такое было вітаньне. Пачалося турэмнае жыцьцё. Кожнага дня выпушчалі нас пагуляць на двор. У дзьвярох стаяў вартавы, але не немец, а паляк, паскудны такі чалавек. Па прозьвішчы Генрых Сянкевіч. Пазьней усіх іх паарыштавалі ці ў Польшчы, ці ў Амэрыцы. За 30 дзён у мяне вырасла чорная барада, дык гэты Сянкевіч падумаў, што я жыд. Ён адмыслова зь мяне зьдзекваўся. Як я праходзіў праз дзьверы, дык ён мяне біў гумовай палкай па галаве, я ледзьве ня падаў. Неяк раз нас павялі ў лазьню, і ён пабег за мной паглядзець, ці я жыд? Упэўніўся — не. На допыце ў гестапа шмат чыноўнікаў гаварылі па-расейску, гэта былі латышы. Латышы заўсёды адыгрывалі страшна паскудную гістарычную ролю. Яны расстрэльвалі пры бальшавіках у ЧК, а як прыйшлі немцы, апынуліся ў складзе вялікай эсэсаўскай дывізіі. Як у нас некалі казалі: ці ёсьць латышская нацыя? Адказвалі: няма. Ёсьць латышская прафэсыя. Не хачу абражаць гонар усяго латышскага народа, але, кажу шчырую праўду, — былі розныя латышы.

Так здарылася, што ў немца Шмідта, гебітскамісара Вялейкі, які забараніў мне семінарыю, быў беларускі даверaны пры Віленскім гебітскамісарыяце Кастусь Касяк, мой былы вучань зь Віленскай беларускай гімназіі. Ён мяне і ўратаваў. Гэта быў дужа таленавіты вучань. Калі я ў Вільні аднойчы захварэў і лёг ва ўнівэрсытэцкі шпіталь, дык Касяк кіраваў занятках па матэматыцы. Пражыў ён усяго каля 30 гадоў. Пра ягоную сьмерць ёсьць дзьве вэрсіі. Адна — што яго павесілі ў Вялейцы пасьля прыходу Чырвонай Арміі. А другая вэрсія была іншая, яна выкладзена ў кнізе Юзафа Мацкевіча, знакамітага польскага пісьменьніка, які апісаў ганебную дзейнасьць АК на беларускіх землях, вынішчэньне беларускай эліты праз нямецкія рукі. Кніга называлася "Не магу маўчаць", гэта быў вельмі шляхотны крок з боку польскага пісьменьніка. Ён напісаў, што Кастусь Касяк загінуў у Валожыне, куды перад канцом быў пераведзены начальнікам раёну, а там на яго данесла немцам АК, і ён быў расстраляны.

Гэта я пра сябе апавядаў, але тое ж рабілася ва ўсёй Заходняй Беларусі. Трэба зазначыць, што напрыканцы акупацыі Беларусі немцы давалі болей магчымасьці беларусам. А напачатку ўся ўлада ў раёнах была ў руках палякаў, якія па загаду АК займаліся справай ліквідацыі беларускай інтэлігенцыі. Можна згадаць вельмі шмат прозьвішчаў нашых людзей, якія тады загінулі. Рабілася гэта спосабам даносаў. Немцы без суда і сьледства адразу расстрэльвалі. Варта было толькі паказаць, што во той камуніст, не зважаючы, ці то праўда, ці не. Быў загад Гітлера зьнішчаць усіх палітрукоў, усіх савецкіх чыноўнікаў ці камуністаў.

Нарэшце немцы зразумелі, чаму палякі скрозь занялі кіруючае становішча. Бо яны прыехалі з Галічыны і першаклясна гаварылі па-нямецку. А мы, беларусы, не. І перакладчыкі тлумачылі немцам так, каб было нам на шкоду. Так прайшло гады два, а пасьля немцы ў адну ноч перастралялі ўсіх польскіх начальнікаў раёнаў. У Маладэчне ў нас быў такі Віктар Уневіч, ён прыкідваўся беларусам. Тады ўжо выгадней было назваць сябе беларусам, чым палякам, бо да палякаў прымаліся больш суровыя меры, чым да беларусаў ці ўкраінцаў. Беларусы і ўкраінцы апынуліся ў немцаў на больш прывілеяваным становішчы. Калі бралі палонных, палякаў і расейцаў не пушчалі, а беларусаў і ўкраінцаў пушчалі дахаты. Дык Віктар Уневіч, начальнік Маладэчанскага раёна, пачуў, што я беларус, інтэлігент, сяджу на печы, увесь час прысылаў да мяне прапановы, каб я выйшаў і што-небудзь рабіў, а не сядзеў на печы. А я думаю: дзякуй табе, бо ты выцягваў людзей наверх, а затым расстрэльваў. Не, лепей буду хавацца. І хаваўся, аж пакуль не пайшоў працаваць у семінарыю. Вось выйшла ў Беластоку кніжка пра адну беларускую дзяячку, нашу былую гімназістку Ганну Катковіч. Яна была толькі перакладчыцай і за гэта страшэнна пацярпела. Яна ўцякла на Захад, у Нямеччыну. Але там папала ў савецкую акупацыйную зону, пасьля перабралася ў Польшчу, і напачатку там нічога зь ёй не здаралася. А затым папалася ў Смерш, які ўсіх гэткіх хапаў і вывозіў у Сібір альбо расстрэльваў. І яе таксама саслалі ў Сібір, дзе яна і памерла. Такі лёс Ані Катковіч.

Астроўскі і ўвесь беларускі актыў бачылі, што немцы адступаюць, што іхняя справа дрэнь і яны цяпер будуць згаджацца з усім, што беларусы захочуць. Далі дазвол на БЦР, арганізацыю, да якой належала школа, СБМ; дазволілі арганізаваць Беларускую самаахову, нешта падобнае да арміі. Усё тое рабілася згары, Астроўскі са сваімі памочнікамі часта не ва ўсім выконвалі загады генеральнага камісарыяту. Немцы, вядома, вагаліся, каб не даць занадта самастойнасьці беларусам ці ўкраінцам. Але нікому яны не далі столькі самастойнасьці, колькі беларусам. Пасьля Курску справы нямецкія пайшлі яшчэ болей уніз, але іхняя карная палітыка не слабела. Я быў тады падрыхтаваны памерці ў нямецкай вязьніцы, і быў выратаваны толькі дзякуючы маім сябрам.

Астроўскага ў часе вайны я амаль ня бачыў. Я зь ім працаваў у Вільні, калі ён быў дырэктарам гімназіі. Тады ён рабіў на нас цудоўнае ўражаньне як беларускі патрыёт і палымяны прамоўца. Мы тады ўжо ўведалі, што ён вялікі беларускі дзяяч, браў удзел у Слуцкім паўстаньні, заклаў у Слуцку першую беларускую гімназію і, здаецца, належаў да БНР у 18-м годзе. Пасьля пераезду ў Вільню ён быў дырэктарам беларускай гімназіі, адначасна адыгрываў вялікую ролю ў дзейнасьці Беларускай сялянска-работніцкай Грамады, а таксама Таварыства беларускай школы, быў скарбнікам БСРГ і старшынёй ТБШ, што пазьней пераняў ад яго Рыгор Шырма. Палякі яго судзілі разам з усімі за ўдзел у Грамадзе. Будучы дырэктарам, ён трапіў у вельмі цяжкую сытуацыю. Тады гімназіі і нашыя вёскі ўсё яшчэ былі пад уплывам камунізму, спадзяваліся, што на Усходзе ствараецца нашая бацькаўшчына, новая наша дзяржава. Камуністычная прапаганда мела вялікі посьпех. Усюды ствараліся гурткі, якія рабілі абструкцыю ўладам і, замест таго каб дапамагчы беларускай справе, толькі шкодзілі ёй. У Віленскай гімназіі ўжо не стала магчыма працаваць. І калі туды прыйшоў Астроўскі, ён найперш пачаў рабіць парадак. Тады падняліся супраць яго, казалі, што ён садзіць вучняў у турму. Але гэта няпраўда, ніколі ён нікога не садзіў. Іншая справа, што многія самі траплялі ў турму, а ён выцягваў з турмы, ратаваў іх. Напрыклад, вучня з Брэста Міколу Засіма, якому ён даў стыпендыю і вывучыў на доктара. Астроўскі заўжды праводзіў вялікую патрыятычную беларускую дзейнасьць. У Вільні ён таксама быў вельмі знаны сярод польскай інтэлігенцыі, выступаў у клюбе Влучэнгі, дзе інфармаваў польскую эліту пра беларускія справы. Некалькі разоў я там быў і чуў, як Астроўскі мужна крытыкаваў польскія ўлады за іх негатыўныя адносіны да беларусаў. У 34-м годзе была зачыненая Наваградзкая беларуская гімназія, у 32-м — Клецкая. Мы ў Навагрудку будавалі новы будынак гімназіі, бацькі вазілі пясок, камяні, працавалі і мы самі. Той будынак пазьней улады ў нас адабралі. А калі будавалі, праз Наваградак праязджаў прэзідэнт Польшчы Ігнат Масьціцкі, і яму даручылі закласьці вуглавы камень. Пры гэтым ён мусіў сказаць прамову, дзе паабяцаў, што ніхто не зачыніць гэтую гімназію. Але пасьля ўсё ж зачынілі. І вось падчас аднаго сходу выступіў Астроўскі, які сказаў: як вам можна верыць? Тады з першага раду ўстаў ваявода віленскі Кірцікліс і сказаў: "Пан дырэктар, вы можаце гаварыць усё, толькі не чапайце нашага дастойнага прэзідэнта". Тое сталася дужа небясьпечна, але Астроўскі быў чалавек мужны.

*(Працяг будзе.)*



**Выкладчыкі Віленскай беларускай гімназіі. Барыс Кіт — першы злева ў другім радзе, 1933 г.**




**Барыс Кіт у класе Наваградскай беларускай гімназіі, 1939 г.**

**ЗАПРАШЭННЕ**

## *Ад юбілейнага аргкамітэта*

*Вечарына з удзелам шырокай грамадскасці, прысвечаная 100-годдзю Б.У.Кіта, адбудзецца ў Мінску 6 красавіка 2010 года ў канферэнц-зале Палаца мастацтва (вул. Казлова, 3).*

*Пачатак а 17-й гадзіне. Уваход вольны.*

Народная Воля http://www.nv-online.info
2—5 КРАСАВІКА 2010 г.

## ПОНЕДЕЛЬНИК, 5 АПРЕЛЯ

### Первый

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** "Новости".
**06.05, 07.10, 08.15** "Доброе утро, Беларусь!".
**07.05, 08.10, 18.50, 00.00** "Зона Х".
**07.30, 08.25, 11.50** "Деловая жизнь".
**08.30** "В мире моторов".
**09.05** "Nota Bene".
**09.35** "Звездные танцы. Мужской сезон".
**11.00, 17.20 "Не родись красивой".** Сериал.
**12.10 "Анна".** Худ.фильм.
**14.05** "Жизнь как жизнь".
**15.15, 19.15** "Новости региона".
**15.25** "Культурные люди".
**15.55** "Здоровье".
**16.20 "Огни большого города".** Сериал.
**18.25** "Прости меня".
**19.25** "КЕНО".
**19.30** "Арена".
**19.55** "Ответный ход".
**21.00** "Панорама".
**21.55** "Специальный репортаж".
**22.10 "Доктор Хаус-4".** Сериал.
**23.10 "Герои-3".** Сериал.
**00.05** "День спорта".

### ОНТ

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.00, 01.20** "Наши новости".
**06.05** "Наше утро".
**09.05** "Контуры".
**10.10, 11.10 "Брюс всемогущий".** Худ.фильм.
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.15, 01.35** "Новости спорта".
**12.00** "Малахов +".
**13.10** "Понять. Простить".
**13.40** "Модный приговор".
**14.45** "Контрольная закупка".
**15.15 "Виола Тараканова. В мире преступных страстей".** Сериал.
**16.15** "Мисс Беларусь-2010".
**18.20 "Моя прекрасная няня. После свадьбы".** Сериал.
**19.00** "Жди меня".
**20.00** "Время".
**21.05** "Выбор".
**22.00 "Остаться в живых".** Сериал.
**23.20** "Преступления века".
**23.55** Авиаслалом.
**00.50 "Женаты... с детьми".** Сериал.

### РТР-Беларусь

**07.00** "Утро России".
**09.20, 19.30 "Однажды будет любовь".** Сериал.
**10.10** "Гибель "воздушного "Титаника". Стратонавты". Док.фильм.
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** "Вести".
**11.25** "Утренняя почта".
**12.00 "Своя чужая сестра".** Худ.фильм.
**13.50, 16.50, 18.50, 00.05** "Новости — Беларусь".
**14.30, 22.55 "Две стороны одной Анны".** Сериал.
**15.20 "Весенняя путевка".** Худ.фильм.
**17.15 "Кулагин и партнеры".** Сериал.
**17.50 "Кармелита. Цыганская страсть".** Сериал.
**20.25 "Телохранитель".** Сериал.
**22.20 "Дворик".** Сериал.
**23.50** "Ничего личного".
**00.15** "Вести +".
**00.35** "Дежурный по стране". Михаил Жванецкий.

### НТВ-Беларусь

**07.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.15** "Сегодня".
**07.05** "Сегодня утром".
**08.25** "Программа максимум".
**09.25** "Чрезвычайное происшествие. Обзор за неделю".
**10.20** "Средний класс".
**10.55** "Кулинарный поединок".
**11.50 "Сыщики".** Сериал.
**13.30 "Блудные дети".** Сериал.
**15.05** "Спасатели".
**15.30, 18.30** "Обзор. Чрезвычайное происшествие".
**16.30 "Кодекс чести-2".** Сериал.
**19.35 "Глухарь. Продолжение".** Сериал.
**21.35 "Час Волкова".** Сериал.
**23.40** "Честный понедельник".
**00.25** "Школа злословия".

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** "24 часа".
**06.10, 17.20** "Минщина".
**06.20, 07.45** "Утро. Студия хорошего настроения".
**07.40, 20.10** "СТВ-спорт".
**08.30** "Неделя".
**09.35** "Большой завтрак".
**10.05** "Пять историй".
**10.40 "Ангел-хранитель".** Сериал.
**11.40, 17.30** "Званый ужин".
**12.35, 18.30 "Мачеха".** Сериал.
**13.50** "Звездный ринг".
**15.00** "Большой город".
**15.40** "Горячий лед".
**16.05** "Культурная жизнь".
**16.50** "Добро пожаловаться".
**17.10** "Наше дело".
**20.00** "Столичные подробности".
**20.20** "Добрый вечер, малыш!".
**20.40 "Стерва".** Худ.фильм.
**22.55** "Столичный футбол".
**23.25 "Иллюзионист".** Худ.фильм.

### ЛАД

**07.00** "ЛАДное утро".
**08.00, 21.35 "Универ".** Сериал.
**08.30, 16.20** "Час суда. Дела семейные".
**09.30** "В этот день".
**09.35, 18.00 "Любовь как любовь".** Сериал.
**10.30 "Щепотка перца".** Худ.фильм.
**12.20** "Пра мастацтва".
**12.45** "Школа ремонта".
**13.40** "Белорусский акцент".
**14.10** "Внеклассный час".
**14.25** "Бухта капитанов".
**15.05** "Тэлебарометр".
**15.25, 23.35 "Оружие".** Сериал.
**17.25** "Простые упражнения" с Юрием Афанасьевым".
**19.05 "Люди Шпака".** Сериал.
**20.05** "Белорусское "Времечко".
**21.20** "Калыханка".
**22.10** Футбол. Чемпионат Англии. Обзор тура.
**23.05** "Хоккей. Формула игры".
**00.25** Тяжелая атлетика. Чемпионат Европы. День 1-й.

### Мир

**04.55** "Афиша".
**05.00, 06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 10.00, 11.00, 12.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 20.00, 21.00, 22.00, 23.00, 00.00, 01.00** "Новости Содружества".
**05.05, 16.05 "Наши соседи".** Сериал.
**06.05** "Вместе".
**07.05** "Союзники".
**07.35** "Легкая жизнь".
**08.05** "Прогресс".
**08.50, 09.45** "Удачная покупка".
**09.05, 18.30** "Общий интерес".
**09.35** "Кыргызстан в лицах".
**09.55** "Билет на сегодня".
**10.05, 03.50 "Волчица".** Сериал.
**11.05, 23.05 "Тройная проверка".** Худ.фильм.
**13.05** "Приключения мастера кун-фу". Мультсериал.
**13.30 "Старшеклассники-2".** Сериал.
**14.05, 01.05 "33 квадратных метра".** Сериал.
**14.30** "Вкусный мир".
**15.20** "Дом с историей".
**17.05 "Богатая и любимая".** Сериал.
**18.20** "Акценты".
**19.05, 01.45** "Слово за слово".
**20.05, 02.50 "Бес в ребро, или Великолепная четверка".** Сериал.
**21.20** "Мир спорта".
**22.05** "Хит-экспресс".

### Белсат

**17.00, 21.00, 23.50** "Аб'ектыў".
**17.05** "Еўропа сёння". Тэлечасопіс канала "Нямецкая хваля".
**17.35 "Арол: крымінальная сага".** Серыял.
**18.35** "Госць "Белсата".
**18.50** "Шанц на "Новае жыццё". Дак.фільм.
**19.20** "Англійская мова з Ліпі і Мэсі".
**19.30** "Прыгоды Ціўкі". Мультсерыял.
**19.40** "Моўнік".
**19.50** "ПраСвет".
**20.10** "Басанож па свеце".
**20.40** "Рэмарка".
**21.20 "Папіён".** Маст.фільм.

## ВТОРНИК, 6 АПРЕЛЯ

### Первый

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** "Новости".
**06.10, 07.10, 08.15** "Доброе утро, Беларусь!".
**07.05, 08.10, 18.50, 00.00** "Зона Х".
**07.30, 08.30, 11.50** "Деловая жизнь".
**08.35** "Арена".
**09.05, 19.55 "Сваты".** Сериал.
**10.05, 16.50 "Огни большого города".** Сериал.
**10.50, 17.50 "Не родись красивой".** Сериал.
**11.40** "Специальный репортаж".
**12.10 "Альпинист".** Худ.фильм.
**13.45** "Off Stage Life".
**14.05** "Ответный ход".
**15.15, 19.15** "Новости региона".
**15.25** "В гостях у шведского короля. Гетеборг и Борос".
**15.55 "Большое зло и мелкие пакости".** Сериал.
**19.25** "КЕНО".
**19.30** "Сфера интересов".
**21.00** "Панорама".
**21.35** Футбол. Лига чемпионов УЕФА. 1/4 финала. "Барселона"—"Арсенал". Прямая трансляция.
**00.05** "День спорта".
**00.20** Футбол. Лига чемпионов УЕФА. Обзор дня.

### ОНТ

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10, 00.50** "Наши новости".
**06.05** "Наше утро".
**09.05** "Жди меня".
**10.00** "Теория невероятности".
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.25, 01.05** "Новости спорта".
**11.10** "Один против всех".
**12.00** "Малахов+".
**13.10** "Понять. Простить".
**13.40** "Модный приговор".
**14.45** "Контрольная закупка".
**15.15 "Виола Тараканова. В мире преступных страстей".** Сериал.
**16.15 "Обручальное кольцо".** Сериал.
**17.05** "Пусть говорят" с Андреем Малаховым".
**18.20 "Моя прекрасная няня. После свадьбы".** Сериал.
**19.00 "Слово женщине".** Сериал.
**20.00** "Время".
**21.05 "Цыганки".** Сериал.
**22.15 "Крем".** Сериал.
**23.30** "Обратный отсчет".
**00.05 "Женаты... с детьми".** Сериал.

### РТР-Беларусь

**07.00** "Утро России".
**09.20, 19.30 "Однажды будет любовь".** Сериал.
**10.10** "Опустела без тебя земля...". Майя Кристалинская". Док.фильм.
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** "Вести".
**11.25** "Ничего личного".
**11.40, 20.25 "Телохранитель".** Сериал.
**13.20, 17.15 "Кулагин и партнеры".** Сериал.
**13.50, 16.50, 18.50, 23.50** "Новости — Беларусь".
**14.25, 22.55 "Две стороны одной Анны".** Сериал.
**15.15 "Суд".** Сериал.
**17.50 "Кармелита. Цыганская страсть".** Сериал.
**22.20 "Дворик".** Сериал.
**00.00** "Вести +".
**00.20** "Влад Галкин. Трудно быть героем...". Док.фильм.

### НТВ-Беларусь

**07.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.15** "Сегодня".
**07.05** "Сегодня утром".
**08.30** "И снова здравствуйте!".
**09.25** "Чистосердечное признание".
**10.20** "Средний класс".
**10.55** "Квартирный вопрос".
**11.55 "Сыщики".** Сериал.
**13.30 "Блудные дети".** Сериал.
**15.10** "Чрезвычайное происшествие. Расследование".
**15.30, 18.30** "Обзор. Чрезвычайное происшествие".
**16.30 "Кодекс чести-3".** Сериал.
**19.20** Футбол. Лига чемпионов. 1/4 финала. ЦСКА (Россия) — "Интер" (Италия). Прямая трансляция.
**21.20 "Глухарь. Продолжение".** Сериал.
**22.25** "Главный герой" представляет...".
**23.40** "Особо опасен!".
**00.40** "Роковой день".

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** "24 часа".
**06.10, 17.20** "Минщина".
**06.20, 07.45** "Утро. Студия хорошего настроения".
**07.40, 20.10** "СТВ-спорт".
**08.30 "Стерва".** Худ.фильм.
**10.05** "Пять историй".
**10.40 "Ангел-хранитель".** Сериал.
**11.40, 17.30** "Званый ужин".
**12.35, 18.30 "Мачеха".** Сериал.
**13.50** "Громкое дело".
**14.40 "Своя команда".** Сериал.
**15.40** "Военная тайна".
**16.50** "Столичный футбол".
**20.00** "Столичные подробности".
**20.15** "Добрый вечер, малыш!".
**20.25 "Солдаты. Дембель неизбежен!".** Сериал.
**21.30 "Отблески".** Сериал.
**22.55** "Главное качество!".
**23.25** "Автопанорама".
**23.45 "Мамонт".** Худ.фильм.

### ЛАД

**07.00** "ЛАДное утро".
**08.00, 21.35 "Универ".** Сериал.
**08.30, 16.15** "Час суда. Дела семейные".
**09.30** "В этот день".
**09.35, 18.00 "Любовь как любовь".** Сериал.
**10.35, 19.05 "Люди Шпака".** Сериал.
**11.35** "Страсти по культуре".
**12.15** Футбол. Чемпионат Англии. Обзор тура.
**13.10** "Хоккей. Формула игры".
**13.35** "Кинопробы".
**13.55** "Белорусский акцент".
**14.25** "Внеклассный час".
**14.40** "Своя компания".
**15.20, 22.40 "Оружие".** Сериал.
**17.20** "Простые упражнения" с Юрием Афанасьевым".
**20.05** "Белорусское "Времечко".
**21.20** "Калыханка".
**22.10** "Спорт-кадр".
**23.30** Тяжелая атлетика. Чемпионат Европы. День 2-й.

### Мир

**04.55** "Афиша".
**05.00, 06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 10.00, 11.00, 12.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 20.00, 21.00, 22.00, 23.00, 00.00, 01.00** "Новости Содружества".
**05.05, 16.05 "Наши соседи".** Сериал.
**06.05** "Тик-так".
**06.20** "Приключения Болека и Лелека". Мультсериал.
**06.30, 07.05 "Перекресток".** Сериал.
**07.35** "Легкая жизнь".
**08.05, 17.05 "Богатая и любимая".** Сериал.
**08.50, 09.45** "Удачная покупка".
**09.05, 18.30** "Всюду жизнь".
**09.35** "Содружество. Live".
**09.55** "Билет на сегодня".
**10.05, 03.50 "Волчица".** Сериал.
**11.05, 23.05 "Нападение на тайную полицию".** Худ.фильм.
**13.05** "Приключения мастера кун-фу". Мультсериал.
**13.30 "Старшеклассники-2".** Сериал.
**14.05, 01.05 "33 квадратных метра".** Сериал.
**14.30** "Откровенный разговор".
**15.20** "Детективные истории".
**18.20** "Акценты".
**19.05, 01.45** "Слово за слово".
**20.05, 02.50 "Бес в ребро, или Великолепная четверка".** Сериал.
**21.20** "Живая история".
**22.30** "Дом с историей".

### Белсат

**17.00, 21.00, 23.05** "Аб'ектыў".
**17.05 "Ранча Піковая Сямёрка".** Серыял.
**17.35** "МакраФон: канцэрт Зміцера Вайцюшкевіча ў тэатры "Буфо".
**18.20** "Басанож па свеце".
**18.45** "Тыдзень з Радыё Свабода".
**19.20** "Англійская мова з Ліпі і Мэсі".
**19.30** "Прыгоды Ціўкі". Мультсерыял.
**19.40** "Праект "Будучыня".
**20.05** "Моўнік".
**20.15** "Акно ў Еўропу".
**20.40** "Ігар Неўпакоеў".
**21.25** "Асабісты капітал".
**21.40 "Каханне, здрада, жарсць".** Серыял.
**22.25** "Форум: "Алергія на войска".

## СРЕДА, 7 АПРЕЛЯ

### Первый

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** "Новости".
**06.05, 00.05** "День спорта".
**06.10, 07.10, 08.15** "Доброе утро, Беларусь!".
**07.05, 08.10, 18.50, 00.00** "Зона Х".
**07.30, 11.50** "Деловая жизнь".
**08.35** "Сфера интересов".
**09.05** Слово митрополита Филарета на Благовещение Пресвятой Богородицы.
**09.20, 20.00 "Сваты".** Сериал.
**10.15, 16.50 "Огни большого города".** Сериал.
**11.05, 17.50 "Не родись красивой".** Сериал.
**12.10** "Зямля беларуская".
**12.25 "Смокинг по-рязански".** Худ.фильм.
**14.05** "Когда рождался новый мир...".
**14.45** "Невидимый фронт".
